

ПАЦАЛАВАНЫЯ НЕБАМ

10–11

ТРАДЫЦЫЙ КАРАГОД

13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЖНІЎНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 161 (30295)


3 першых вуснаў

# «БЕЛАРУСЬ — ДЗЯРЖАВА ДЛЯ НАРОДА. ТАМУ ЎСЕ РАШЭННІ ПРЫМАЮЦЦА ВЫКЛЮЧНА Ў ІНТАРЭСАХ ЛЮДЗЕЙ»

## Якія пытанні кіраўнік дзяржавы паставіў перад кіраўніцтвам урада

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пачаў новы рабочы тыдзень з пытанняў у сферах эканомікі і сацыяльнай палітыкі. У панядзелак кіраўнік дзяржавы сабраў нараду з кіраўніцтвам Савета Міністраў, каб абмеркаваць тое, што хвалюе людзей, і знайсці шляхі вырашэння праблем. «Беларусь — дзяржава для народа. Таму ўсе рашэнні прымаюцца выключна ў інтарэсах людзей», — зрабіў акцэнт беларускі лідар. Ён вылучыў некалькі пытанняў, вынесеных на парадак дня нарады.**



Фота БелТА.

### ПЕРШАЕ. ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ГРАМАДЗЯН ЖЫЛЛЁМ

Па словах Прэзідэнта, гэта было і застаецца адной з прыярытэтных задач для дзяржавы. «Уласны дах над галавой важны для любога чалавека, а асаблівa для маладой сям'і. Гэта яе ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Мы ўвесь час удасканальваем падыходы да аказання дзяржаўнай падтрымкі пры паляпшэнні жыллёвых умоў, у першую чаргу ў сельскай мясцовасці. І мы вельмі шмат апошнім часам казалі пра карэкціроўкі нашай жыллёвай палітыкі. Мы гаварылі пра тое, што прыярытэтам было і застаецца забеспячэнне жыллём шматдзетных сем'яў, ваеннаслужачых і гэтак далей. Таму на нашай сустрэчы пытанне нумар адзін — спрашчэнне працэдур будаўніцтва і крэдытавання жылля», — сказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў пра сваё даручэнне ўраду комплексна падысці да паляпшэння заканадаўства ў гэтай галіне. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што статыстыка па ўводзе жылля другі год запар адмоўная. У справаздачах аналітыкаў адна з першых прычын адтоку кадраў з невялікіх населеных пунктаў — адсутнасць магчымасці набыць уласнае жыллё або хоць бы засяліцца ў арганізаванае камфортнае і добраўпарадкаванае арэнднае. «Сёння трэба надаць новы імпульс жыллёваму будаўніцтву ў вёсцы, у тым ліку індывідуальных дамоў, будаўніцтву прамысловымі прадпрыемствамі арэнднага жылля для сваіх работнікаў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Урадам прапанаваны цэлы комплекс навацый. Ад спрашчэння падключэння да інжынернай інфраструктуры індывідуальных дамоў да пашырэння фінансавай падтрымкі маладым сем'ям (да 31 года). Усе навацыі разгледжаны экспертным саветам пры Савеце Рэспублікі, у Камітэце дзяржаўнага кантролю, Адміністрацыі Прэзідэнта. «Аднак, як мне вядома, агульнай згоды па дакументах не дасягнута, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Напрыклад, няясна, для чаго абавязваць забудоўшчыка прымяняць праектную дакументацыю пры ўзвядзенні індывідуальных дамоў на вёсцы, калі ад гэтага адмовіліся яшчэ год таму».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на нарадзе трэба абмеркаваць рацыянальнасць кожнага змянення, каб людзям, якіх гэтыя новаўвядзенні датычацца напрамую, было дакладна зразумела, як будзе вырашацца іх жыллёвае пытанне. Перад профільным міністрам кіраўнік дзяржавы паставіў шэраг пытанняў. Ці сапраўды ўсе прапанаваныя меры спрашчаюць працэдуры будаўніцтва, каб не атрымалася бачнасць замест вырашэння пытання. Ці дазволіць абноўленае заканадаўства разгарнуць жыллёвае будаўніцтва? Як у гэтых працэдурах задзейнічаны банкаўскі сектар, ці будзе ў запланаванай падтрымкі дастатковае фінансаванне? «І, як вы памятаеце, усе нормы павінны быць выкладзены простай, чалавечай мовай, без бюракратычнага нагрувашчвання змен у дзясятку ўказаў», — акцэнтаваў увагу беларускі лідар.

СТАР. 2

## КОРАТКА

• У Беларусь з афіцыйным візітам прыбыла парламенцкая дэлегацыя Ісламскай Рэспублікі Пакістан на чале са спікерам Нацыянальнай асамблеі парламента Ісламскай Рэспублікі Пакістан Сардарам Аязам Садзікам.

• **Доля ўкладаў фізічных асоб у беларускіх рублях перасягнула долю ўкладаў у замежнай валюце і на 1 ліпеня 2024 года склала 51,5 працэнта.**

• Каля 2,2 тысячы фур чакаюць уезду ў ЕС.

• **Пятая навукова-асветніцкая экспедыцыя «Расатама» «Ледакол ведаў», якая сёлета ўпершыню праходзіць у міжнародным фармаце, у тым ліку з удзелам беларусаў, дасягнула Паўночнага полюса на атамным ледаколе «50 гадоў Перамогі».**

• У Магілёўскай вобласці праіндэксаваны імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё».

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іна МЯДЗВЕДЗЕВА, старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта:**

*«Статыстычныя паказчыкі ўплываюць на прыняцце важных сацыяльна-эканамічных рашэнняў. Гэты працэс старанна адсочваецца. Гэта значыць, пры прадстаўленні даных па развіцці любой сферы (няхай гэта будзе прамысловасць, сельская гаспадарка, рэгуляванне цэн) яны неабходны для таго, каб прыняць рашэнне, як рэгуляваць, дзе ёсць праблемныя пытанні, як іх устараняць. Адпаведна нашы даныя з'яўляюцца падмуркам для таго, каб паляпшаць не проста работу канкрэтных прадпрыемстваў, але і непасрэдна жыццё людзей у кожным рэгіёне».*

Фестывалім

## Як здобная пляцёнка славу гораду прынесла

### У Свіслачы трэці раз прайшоў каравай-фэст «Бацькава булка»




**Сёлета свята выйшла на ўзровень рэспубліканскага. У ім прынялі ўдзел найлепшыя пекары краіны, якія прадэманстравалі высокае майстэрства. Разам з тым змест фестывалю значна пашырыўся. Да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў была арганізавана экспазіцыя франтавога хлеба. Пад лозунгам «Мір. Гаспадар. Дабрабыт» прайшла відовішчная выстаўка «Бацькаўшчына», прысвечаная 30-годдзю інстытута Прэзідэнцтва.**

СТАР. 5

Спажывец

## ГРЫБНЫ СЕЗОН

### Пачым у гэтым жніўні прадаюць баравікі і падасінавікі?

**Гэты год аматары ціхага палявання называюць грыбным. Зрэшты, дадаючы, што канчаткова гэта яшчэ незразумела: маўляў, грыбы пайшлі ў рост, таму што былі дажджы. А цяпер, калі такая суш захаваецца, гэтыя дары лесу як пачаліся, так і скончацца... Але пакуль што грыбоў (і грыбнікоў) шмат і ў лясах, і на рынках.**



Па абочынах лясных дарог расцягнуліся чароды машын, а пад тэнтамі вялікіх кірмашоў і маленькіх рыначкаў лунае грыбны водар: у Беларусі — канец лета. Самы час назбіраць (або хаця б купіць) свежых лясных грыбочкаў — сапраўдных, дзікіх, а не «пластыкавых», «прыручаных» шампіньёнаў — і насмажыць іх сабе цэлую патэльню, з бульбачкай і цыбуляй, не шкадуючы алею і напляваўшы на сярэднясутачную норму калорый пры сядзячай рабоце. Час дазволіць сабе адну з гэтых маленькіх, быццам бы нязначных радасцяў, нязменных з дзяцінства...

СТАР. 8

ISSN 1990 — 763X

24161

# «БЕЛАРУСЬ — ДЗЯРЖАВА ДЛЯ НАРОДА. ТАМУ ЎСЕ РАШЭННІ ПРЫМАЮЦЦА ВЫКЛЮЧНА Ў ІНТАРЭСАХ ЛЮДЗЕЙ»

### ДРУГОЕ. УДАСКАНАЛЕННЕ ТРАНСПАРТНАЙ ІНФРАСТРУКТУРЫ

«Больш за год таму да мяне звярнуўся інвестар з прапановай аб стварэнні адзінага нацыянальнага аператара. Прапаноўвалася аб'яднаць пад яго крылом усе наяўныя ў краіне інтэлектуальныя транспартныя сістэмы (платныя дарогі, паркавальную сістэму, вагагабарытны кантроль, сістэму фотафіксацыі парушэнняў). Я даручаў найпадрабязнейшым чынам прапрацаваць гэтую тэму ва ўрадзе, зразумела, выключна ў дзяржаўных інтарэсах. Прынамсі, каб было лепей, чым цяпер, і гэта адлюстроўвалася ў фінансах. Бо калі ўжо праводзіць лічбавую трансфармацыю транспартнай інфраструктуры, то самым перадавым і зручным для людзей спосабам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён прывёў усім вядомы прыклад — поўны хаос у плане парковак, асабліва ў сталіцы: «У самым населеным нашым горадзе — Мінску — нямала аматараў запхнуць сваю машыну куды заўгодна. Нават пры наяўнасці платных зон, размешчаных па ўсім цэнтры, ёсць такія грамадзяне, якія аўтамабіль там паставяць, але не заплацяць. Гэта значыць, аплатнай дысцыпліны няма. І прапаноў па яе ўстанаўленні таксама няма».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Фота БелТА.

Падобная сітуацыя, па словах кіраўніка дзяржавы, і з захаваннем вагавых абмежаванняў на дарогах. Кантралёры штогод выяўляюць дзясяткі тысяч парушэнняў. «А гэта ж захаванасць нашых дарог, якія цяжкавагавы транспарт папросту руйнуе, — заўважыў ён. — Таму галоўнае пытанне такое: ці сапраўды адзіны нацыянальны аператар умацуе дарожную і грамадскую бяспеку, а таксама зможа павысіць фінансавую і тэхналагічную дысцыпліну? Калі так, то які аб'ём інвестыцый запатрабуецца для рэалізацыі праекта? Якія тэрміны акупляльнасці? Ці пралічаны будучыя паступленні ў бюджэт? Дзе возьмем грошы? Пакуль я бачу, што дакладнага і яснага адказу на пастаўленыя пытанні няма».

Прэзідэнт пацікавіўся, якія выгады нясе краіне прапанаваная кансалідацыя сістэм? Наколькі дакладныя эканамічныя эфекты, што прагназуе інвестар? Ці ў яго «бізнес-плане» галоўны фактар росту — гэта павышэнне тарыфаў? «Таксама чакаю тлумачэнняў, за кошт чаго можна дабіцца эканоміі бюджэтных сродкаў, пра якую заяўляе інвестар», — сказаў ён.

### ТРЭЦЯЕ. СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў аграпрамысловы сектар пастаянна ўкладваюцца каласальныя сілы і сродкі. Нядаўна запусцілі чарговы віток мадэрнізацыі. Атрымалі станоўчую дынаміку ў жывёлагадоўлі: сёлета вытворчасць малака павялічылі амаль на 6,5 працэнта, жывёлы і птушкі — амаль на 4,5 працэнта. «Аднак за гэтымі лічбамі стаіць жахлівая колькасць загінулага пагалоўя. Таму сёння пытанне выбракоўвання буйной рагатай жывёлы вынесена на самы высокі ўзровень. Камітэт дзяржкантролю дакладвае: амаль паўсюдна аснаўное выбыццё — з-за хвароб. Толькі за паўгоддзе загінула 70 тысяч галоў. Сярод іх цялят ад нараджэння да паўгода — больш за палову, амаль 40 тысяч! — звярнуў увагу беларускі лідар. — Гэта абуральная безгаспадарчасць. Калі некалі ў мужыка ў вёсцы карова гінула — гэта была трагедыя сусветнага маштабу. А цяпер чамусьці прывыклі хавацца за нарматывамі і стандартамі. Жах. Якія яшчэ нарматывы, асабліва ў Магілёўскай вобласці, я чую, па падзяжы жывёлы? Якія нарматывы?»

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што павінен быць толькі адзін зразумелы стандарт — здаровая жывёла, якая ўтрымліваецца ў добрых умовах. І тады, па яго словах, не будзе быцця ні нарматыўнага, ні звышнарматыўнага. Прэзідэнт папрасіў міністра сельскай гаспадаркі прадметна далажыць аб стане спраў па выбракоўванні буйной рагатай жывёлы. Таксама Прэзідэнт звярнуў увагу на камплектаванне малочнатаварных комплексаў, якіх у краіне пабудавана нямала. «Каго мы там доім? Калі карову, то чаму з казіным надоем?» — іранічна заўважыў ён.

### ЧАЦВЁРТАЕ. АБ АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ РАМЕСНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Сёлета прыняты абноўлены Закон па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці, з якога вынікае, што рамеснікі становяцца часткай прадпрымальніцкай супольнасці.

Па прапанове ўрада з 1 кастрычніка гэтага года можна стаць рамеснікам выключна па ўстаноўленым пераліку відаў дзейнасці. Гэты пералік у найбліжэйшыя дні вызначыць урад. «Да прыняцця рашэння аб падпісанні ўказа хачу пачуць адказы на наступныя пытанні. Якія змены прапануюцца? Чым абумоўлены гэты выбар? Ці абмяркоўваліся гэтыя змены з насельніцтвам? — спытаў Прэзідэнт. — Да канца года не толькі я, але і ўсё насельніцтва павінна дакладна разумець, якія віды дзейнасці з 1 студзеня будучага года будуць законныя».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што неабходна дакладна вызначыць, каго адносіць да «іпэшнікаў», каго — да рамеснікаў, якія падаткі павінна плаціць кожная з гэтых катэгорый, у якіх сферах будуць ажыццяўляць сваю дзейнасць.

«Усё павінна быць дакладна, празрыста, без усялякай кашы і цяганіны, — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. — І трэба звярнуць увагу, ці не створыць прапанаванае рэфармаванне перадумовы для пераходу часткі рамеснікаў, кірункі дзейнасці якіх выпадуць з пераліку, у ценявы сектар? І ці не страцім мы нейкае рэдкае рамяство, асабліва што датычыцца культурнай спадчыны Беларусі?»

❍ У тэму

## НА НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ, ЯКІЯ ПАСТАВІЎ ПРЭЗІДЭНТ, ЖУРНАЛІСТАМ АДКАЗАЛІ ЎДЗЕЛЬНІКІ НАРАДЫ

### «Дзяржпадтрымка будзе сканцэнтравана ў больш профільныя кірункі»

**Міністр будаўніцтва і архітэктуры Руслан ПАРХАМОВІЧ** расказаў, што тэндэнцыя на будаўніцтва арэнднага жылля ў краіне будзе пашырацца. На нарадзе абмяркоўваліся пытанні падтрымкі юрыдычных асоб пры будаўніцтве арэнднага жылля для сваіх работнікаў. Па словах міністра, яны будуць мець поўныя прэферэнцыі: ім будзе пагашацца практычна палова ад стаўкі таго крэдыту, які яны будуць браць для таго, каб у далейшым даваць арэнднае жыллё сваім работнікам. Пры гэтым не менш за 20 працэнтаў такога жылля будуць выдзяляць маладым спецыялістам. Але гэта зусім не адзінае пытанне жыллёвай сферы, якому падчас нарады з кіраўніцтвам Саўміна ўдзялялася ўвага. «Мы адпрацавалі цэлы пакет дакументаў у адносінах да жыллёвага будаўніцтва. Улічваючы перагружанасць і складанасць нарматыўных прававых актаў па аказанні дзяржпадтрымкі пры будаўніцтве жылля, было прынята рашэнне да канца года падрыхтаваць адзін вялікі сістэмны дакумент, які будзе ў тым ліку і пераглядаць падыходы да дзяржпадтрымкі. Гэта будзе датычыцца змянення Жыллёвага кодэкса адносна норм патрэбы, катэгорый маючых патрэбу і парадку аказання той ці іншай дзяржаўнай падтрымкі», — расказаў Руслан Пархамовіч. Па яго словах, асаблівая ўвага будзе накіравана на будаўніцтва арэнднага жылля для шматдзетных сем'яў, ваенных і іншых катэгорый. «Дзяржпадтрымка будзе сканцэнтравана ў больш вузкія і больш профільныя і актуальныя кірункі», — удакладніў міністр. Распрацоўка адзінага комплекснага дакумента — сёння пытанне надзвычай актуальнае. Для таго каб замацаваць усе навацыі, якія прапануюцца, неабходна ўнесці змяненні ў пяць указаў Прэзідэнта і пры гэтым пазбегнуць юрыдычных калізій. Менавіта таму і прапаноўваецца падрыхтаваць адзіны комплексны дакумент, які вызначае правілы гульні для ўсіх. Разам з тым гэта не выключае таго, што некаторыя пытанні будуць вырашаны ў бліжэйшы час і замацаваны ў іншых нарматыўных прававых актах.

Таксама Руслан Пархамовіч расказаў, што сёння прапаноўваецца істотна спрасціць падыходы па падключэнні індывідуальнага жылля да інжынерных камунікацый. Цяпер юрыдычнай або фізічнай асобе трэба толькі прынесці заяву ў эксплуатацыйную арганізацыю і аплаціць паслугі. Іншымі працэдурамі — праектаваннем, зборам тэхумоў, афармленнем дакументаў — будзе займацца эксплуатацыйная арганізацыя. «Гэта істотна аблегчыць жыццё і грамадзянам, і эксплуатацыйным арганізацыям. Усё ж такі адказваць за інжынерныя сеткі павінны тыя, хто ў далейшым іх эксплуатуе», — растлумачыў міністр.

### Самае галоўнае — каб гэта было эфектыўна

Прэзідэнт даручаў дэталёва прапрацаваць пытанне стварэння адзінага аператара транспартнай інфраструктуры. Падчас нарады яму далажылі аб першых выніках. Пасля нарады **віцэ-прэм'ер Анатоль СІВАК** расказаў журналістам, што сёння розныя сэрвісы знаходзяцца на розным этапе развіцця і маюць рознае прызначэнне, таму да стварэння аб'яднанага аператара ёсць пярэдумовы. «Самае галоўнае, каб гэта было больш эфектыўна. На гэтым этапе не ўсе разлікі завершаны», — адзначыў ён. Анатоль Сівак растлумачыў, што галоўная задача аб'яднання ўсіх інтэлектуальных транспартных сістэм у адну — аптымізацыя рэсурсаў. Гэта ў канчатковым выніку дапаможа павысіць бяспеку дарожнага руху. Сёння кожны від парушэння фіксуецца асобнай камерай, кожная з якіх належыць розным аператарам. Плануецца, што пасля аб'яднання транспартных сістэм адна камера зможа фіксаваць розныя парушэнні і кіраваць гэтай сістэмай будзе адзіны нацыянальны аператар. Гэтай прапанове ўжо амаль год, і яна ідзе няпроста. Таму што ўзнікаюць пытанні, напрыклад, як сэрвіс з паркоўкамі аб'яднаць з сэрвісам па фотафіксацыі перавышэння хуткасці? Па словах віцэ-прэм'ера, гэта пытанне пастаянна абмяркоўваецца ва ўрадзе.

### З удасканаленнем тэхналогій трэба ўдасканаліць і падыходы

**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Антоль ЛІНЕВІЧ** расказаў, якія меры прымаюцца для таго, каб мінімізаваць падзеж жывёлы, за што кіраўнік дзяржавы нярэдка крытыкуе АПК, і як захаваць пагалоўе буйной рагатай жывёлы. Па словах міністра, прагрэсіўныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы арыентаваны на тое, каб сістэмна, тэхналагічна працаваць і ажыццяўляць вытворчасць малака на высокім сучасным узроўні. Але гэтыя працэсы патрабуюць наяўнасці буйной рагатай жывёлы з высокай прадукцыйнасцю. Таму менш прадукцыйных жывёл даводзіцца выбракоўваць. Усяго ў 2023 годзе выбракавана 545 тысяч галоў кароў, або 39 працэнтаў ад агульнага пагалоўя па годзе. Больш за ўсё — у Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцях, дзе самыя высокія ўдоі па краіне.

«Мы ставім пагалоўе на сучасныя комплексы і ставім сабе мэту атрымліваць пры вытворчасці малака ўдоі на ўзроўні перадавых краін. Па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях удоі складаюць вышэй за 7 тысяч літраў у год, па Мінскай наблізіліся да пэўнай планкі. З улікам гэтага павялічваюцца патрабаванні да жывёлы — яна павінна быць з добрай малакааддачай. Цяпер інтэнсіўныя спосабы вытворчасці малака, мы хочам атрымаць максімальную эканамічную выгаду», — растлумачыў Анатоль Лінёвіч.

Па словах міністра, у пытанні захаванасці жывёлы, скарачэння падзяжу і выбракоўвання патрэбна жорсткае выкананне вытворчай і тэхналагічнай дысцыпліны. Устаноўленых правілаў вельмі шмат. Але з удасканаленнем тэхналогій трэба ўдасканаліць і падыходы. «Трэба больш прадметна займацца падрыхтоўкай высокаэнергетычных кармоў, ствараць вакол буйных комплексаў пашы, каб можна было пасвіць жывёлу, укамплектоўваць ветэрынарную службу. Магчыма, варта стварыць перасоўныя кармавыя лабараторыі, каб карэкціраваць рацыён жывёл. Мы над гэтым працуем», — запэўніў Анатоль Лінёвіч.

### Асноўнае патрабаванне — захаванне беларускай самабытнасці

**Міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР** расказаў, якім будзе пералік відаў дзейнасці для рамеснікаў. Першае — ён будзе значна карацейшы за той, што дзейнічае цяпер. Другое, асноўнае патрабаванне, — захаванне аўтэнтычных, самабытных нашых рамёстваў. «Усё гэта павінна рабіцца рамеснікамі сваімі рукамі і з дапамогай прымітыўных прылад працы», — растлумачыў міністр. Тыя віды дзейнасці, якія не трапяць у пералік, што рыхтуецца, можна будзе ажыццяўляць, напрыклад, у якасці самазанятых з выплатай падатку на прафесійны даход (10 працэнтаў). «Для тых самых унікальных рамеснікаў прадугледжаны спецыяльны збор шэсць з палавай рублёў у месяц, і яны змогуць спакойна займацца сваім рамяством», — удакладніў Юрый Чабатар. Папулярныя на сёння віды дзейнасці, такія як, напрыклад, выраб прадметаў з эпаксіднай смалы, гіпсу, варэнне мыла, у гэты пералік не трапяць, паколькі ў іх няма беларускай самабытнасці. Юрый Чабатар падкрэсліў, што ўсе пералікі відаў дзейнасці абмяркоўваліся на розных платформах, і ў выніку два з іх ужо былі зацверджаны — для індывідуальных прадпрымальнікаў (крыху больш за 120 відаў) і для самазанятых (крыху больш за 80 відаў). Трэці — для рамеснікаў — павінен з'явіцца найбліжэйшым часам. Усе гэтыя пералікі ўзаемаўвязаны, каб не было канфлікту інтарэсаў.

Валерыя СЦЯЦКО.

З першых вуснаў

# «МЫ ДАЛЁКА АД ВАС ГЕАГРАФІЧНА, АЛЕ ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ БЫЦЬ ПОБАЧ У ВЫРАШЭННІ САМЫХ НАДЗЁННЫХ ЗАДАЧ»

**У суботу Прэзідэнт Беларусі па запрашэнні прэм'ер-міністра Індыі прыняў удзел у саміце «Голас Глабальнага Поўдня». Гэты віртуальны саміт праводзіцца ў Нью-Дэлі трэці раз. На кожны запрашаецца асобна падабраная група кіраўнікоў дзяржаў. На гэты форум запрошаны 16 краін, у іх ліку Беларусь.**

## ВЫСТУПЛЕННЕ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ НА ТРЭЦІМ САМІЦЕ «ГОЛАС ГЛАБАЛЬНАГА ПОЎДНЯ»

Паважаны спадар Модзі!

Паважаныя сябры!

Дзякуй за запрашэнне выступіць на трэцім саміце «Голас Глабальнага Поўдня», які ператвараецца ў адзін з найбуйнейшых форумаў па абмеркаванні пытанняў сучаснага светаўладкавання і будучыні чалавецтва.

Мы аб'яднаны агульнымі мэтамі і падыходамі да вырашэння сусветных праблем. Гэта пабудова шматпалярнага свету, стварэнне сістэмы непадзельнай бяспекі, забеспячэнне ўстойлівага развіцця, умацаванне раўнапраўнага супрацоўніцтва. І самае галоўнае — павышэнне ўзроўню жыцця нашых народаў.

Эпоха заходняга панавання адыходзіць у мінулае. Цэнтр глабальнага прагрэсу, эканамічнай гравітацыі, ды і прыняцця палітычных рашэнняў перамяшчаецца на Поўдзень і Усход. Гэта патрабуе ад нас больш актыўна праяўляць лідарства ў міжнародных справах. Голас Глабальнага Поўдня павінен гучаць на поўную моц і адпавядаць свайму гіганцкаму патэнцыялу.

Апаненты адчуваюць такую ўзрастальную магутнасць і спрабуюць ёй процідзейнічаць.

Абсалютна мае рацыю прэм'ер-міністр Індыі, гаворачы, што «большасць глабальных праблем не былі створаны Глабальным Поўднем, але на нас яны ўплываюць больш».

Беларусь гэта добра ведае па сваім уласным вопыце. На працягу шэрагу гадоў мы жывём пад незаконнымі, несправядлівымі, варварскімі санкцыямі, якія не толькі аказваюць уздзеянне на нашу краіну, але і згубна ўплываюць на вашы народы.

Так, абмежаванні адносна экспарту беларускіх мінеральных угнаенняў абвастрылі праблемы недахопу прадуктаў харчавання і голаду ў самых бедных краінах.

Захад па-ранейшаму правакуе канфлікты, якія спараджаюць шматмільённыя патокі бежанцаў, а потым цынічна абвінавачвае Глабальны Поўдзень і нас у міграцыйным крызісе. Аднак сапраўдная прычына — у выцягванні рэсурсаў і навязванні краінам, якія сталі на шлях развіцця, сістэмы неэквівалентнага абмену.

Сёння многія рэгіёны скалануюць войны і канфлікты. Каб дагадзіць транснацыянальным карпарацыям, небывалыя тэмпы набірае гонка ўзбраенняў. Але без устойлівага міру і вырашэння глабальных супярэчнасцяў ніякае развіццё немагчыма.

Менавіта таму Беларусь неаднаразова выступала з мірнымі ініцыятывамі і брала на сябе ролю перагаворнай пляцоўкі па ўрэгуляванні канфліктаў. Мы будзем і ў далейшым няўхільна прадаўжаць гэту работу.

Беларусь нацэлена ўносіць уклад ва ўмацаванне Глабальнай Большасці, актыўна ўдзельнічаючы ў міжнародных структурах, якія нас аб'ядноўваюць: у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Руху недалучэння, Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, а таксама БРІКС, партнёрамі якой мы разлічваем стаць у найбліжэйшай перспектыве.

Дарагія сябры!

Больш як паўстагоддзя таму пала сусветная сістэма каланіялізму, але гэта не прывяло да рэальнага вызвалення краін так званага трэцяга свету. Каланіяльных краін. Дэ-факта ў многім захоўваецца эканамічная і тэхналагічная залежнасць ад былых метраполій.

Таму галоўны фронт нашай сённяшняй работы — эканоміка як аснова любога суверэнітэту. І менавіта ў эканамічнай сферы нам ёсць што прапанаваць краінам Глабальнага Поўдня.

Мы даўно і актыўна, яшчэ з часоў СССР, супрацоўнічаем з дзяржавамі Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі. Пастаянна аказваем гуманітарную дапамогу краінам, якія маюць у гэтым патрэбу. Аднак нашы магчымасці значна шырэйшыя.

Беларусь — адзін з сусветных лідараў у дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Нягледзячы на знешні націск, наша краіна дэманструе высокую ступень стабільнасці і прадаўжае паступальна развівацца.

Як рэспубліка з добра развітымі прамысловасцю, сельскай гаспадаркай, навукай, сістэмай адукацыі мы гатовы прапанаваць Глабальнаму Поўдню прадукты харчавання, прамысловую прадукцыю, тэхналогіі, у тым ліку лічбавыя, перадавыя практыкі ў ахове здароўя, уключаючы тэлемедыцыну, паслугі па падрыхтоўцы кадраў і ў іншых сферах.

У нас ужо ёсць вопыт эфектыўнага садзейнічання прагрэсу шэрагу краін Глабальнага Поўдня, іх індустрыялізацыі, павышэнню якасці і ўзроўню жыцця насельніцтва.

У якасці прыкладу можна прывесці Рэспубліку Зімбабвэ, якая з нашай дапамогай паспяхова забяспечвае харчовую бяспеку, развівае сістэму аказання медыцынскай дапамогі і аховы мацярынства і дзяцінства.

Можа, мы далёка ад вас геаграфічна, але заўсёды гатовы быць побач у вырашэнні самых надзённых задач.

Упэўнены, разам мы здольны даць дастойны адказ любым выклікам сучаснасці.

Як сказаў вялікі Махатма Гандзі: «Калі жадаеш, каб свет змяніўся, — сам стань гэтым змяненнем». Упэўнены, што разам мы можам змяніць гэты свет, а голас Глабальнай Большасці — гэта голас нашай агульнай будучыні.

Дзякуй вам за ўвагу.

# НАСТУПСТВЫ КУРСКА, УЗМАЦНЕННЕ ГРАНІЦ І ПАГРОЗА ТРЭЦЯЙ СУСВЕТНАЙ

## Падрабязнасці вялікага інтэрв'ю Прэзідэнта тэлеканалу «Расія»

**Інтэрв'ю з кіраўніком беларускай дзяржавы працягвалася каля дзвюх гадзін. Аляксандр Лукашэнка падрабязна, шчыра і адкрыта адказаў на пытанні журналіста, якія датычыліся шырокага спектра тэм, уключаючы беларуска-расійскае супрацоўніцтва, пытанні рэгіянальнага і міжнароднага парадку дня.**

Размова ішла, у прыватнасці, аб мерах па забеспячэнні бяспекі Беларусі і Расіі, а таксама ў цэлым Саюзнай дзяржавы, аб сітуацыі ва Украіне і шляхах вырашэння канфлікту, аб рэакцыі на паводзіны заходніх суседзяў і абстаноўцы на граніцы. Абмяркоўваліся таксама асобныя аспекты ўнутранай палітыкі, асабістая роля Прэзідэнта ў развіцці краіны і яго планы на перспектыву.

У ліку гарачых інфармацыйных тэм, па якіх Аляксандр Лукашэнка даў прадметныя падрабязныя адказы, — інцыдэнт з парушэннем украінскімі беспілотнікамі паветранай прасторы Беларусі, «чырвоныя лініі» ў пытаннях бяспекі, падзеі ў Курскай вобласці. Адказваючы на пытанні журналіста, кіраўнік дзяржавы таксама пракаментаваў апошнія заявы Польшчы і Украіны.

### Аб абароне дзяржграніцы: ніякіх «чырвоных ліній», адказ будзе імгненны

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што ў выпадку парушэння дзяржаўнай граніцы адказ будзе імгненны.

Адно з пытанняў датычылася хамскага адказу з боку ўкраінскага МЗС на заяву МЗС Беларусі накont парушэння беспілотнікамі паветранай прасторы нашай краіны. Украінскія афіцыйныя асобы адказалі, што ў гэтай тэме няма чаго і абмяркоўваць, гэта не тое, пра што трэба задумвацца.

### Аб перспектывах інтэграцыі з Расіяй: ісці па шляху двух прэзідэнтаў

Выбудоўваць інтэграцыйныя сувязі паміж Беларуссю і Расіяй трэба па прыкладзе адносін лідараў дзвюх краін. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў у час інтэрв'ю тэлеканалу «Расія».

Кіраўніка дзяржавы спыталі, як ён ацэньвае цяперашні этап развіцця Саюзнай дзяржавы, наколькі яна трывалая і непарушная і што яшчэ трэба зрабіць для большай інтэграцыі. «Магу сказаць проста: вам у Расіі і нам у Беларусі трэба ісці па шляху двух прэзідэнтаў. Вы бачыце нашы адносіны — абсалютна блізкія. У Прэзідэнта Пуціна ні з кім няма такіх адносін, як з Беларуссю. Гэта натуральна. Тут нічога не трэба прыдумляць, ніякай канспіралогіі. Мы саюзнікі — гэтым усё сказана», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

### Аб уварванні ВСУ ў Курскую вобласць: ідзе барацьба на павышэнне ставак

«Я згодны з Пуціным, калі ён сказаў, што ідзе барацьба на павышэнне ставак. Што яны хочуць, калі раптам будуць перагаворы, выйграць больш моцную пазіцыю. Так і Захад кажа, ва Украіне пра гэта мараць. Але паўстае іншае пытанне: у такой сітуацыі і падобных хто будзе весці перагаворы?» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

### Аб забароне на ўезд беларускіх аўто ў Літву

«Вар'яты. Я б на вашым месцы пытанні датычна Літвы і не каментаваў. Бо яны не ведаюць самі, што робяць. Гэта вар'яты, самыя сапраўдныя вар'яты. Ну што пра іх казаць. Калі б там былі адказныя палітыкі, мы маглі б абмяркоўваць іх палітыку. Але там адказных палітыкаў няма», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, з эканамічнага пункту гледжання ў гэтым рашэнні літоўскіх улад ёсць нават плюсы. «Дзякуй Богу. Нашы перастануць вывозіць (хоць цяпер паменш стала) грошы за межы Беларусі і Расіі. Тое ж самае расіяне. Грошы застануцца тут. Гэты так званы эканамічны турызм — вялікія сродкі, якія вывозіліся адсюль», — сказаў Прэзідэнт.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Амерыканскі бізнесмен перакананы, што эканоміку ЗША чакае найбуйнейшы крах у гісторыі



Заснавальнік файлаабменнай сеткі Megaupload Кім Доткам мяркуе, што ЗША чакае найбуйнейшы ў гісторыі эканамічны крызіс, за якім наступіць канец эпохі долара. «Канец дамінавання долара ЗША, якія не змогуць нарошчваць доўг», — напісаў Доткам на сваёй старонцы ў сацсетцы, дадаўшы, што друкаванне грошай будзе іх адзіным інструментам. Гіперінфляцыя, на думку бізнесмена, знішчыць актывы ЗША. «Чакайце найбуйнейшага краху ў гісторыі», — папярэдзіў ён. Доткам стаў шырока вядомы інтэрнэт-карыстальнікам многіх краін свету пасля таго, як у 2005 годзе заснаваў файлаабменную сетку Megaupload. Пасля таго як у 2012 годзе пад ціскам амерыканскіх праваахоўных органаў гэты файлаабменнік закрылі, ён заснаваў іншы аналагічны рэсурс — Mega, які таксама хутка стаў вельмі папулярным ва ўсім свеце. З 2010 года бізнесмен пражывае ў Новай Зеландыі. Улады гэтай краіны нядаўна прынялі рашэнне экстрадаваць Доткама ў ЗША.

### Пакістан спрасціў візавы рэжым для замежных турыстаў



Улады Пакістана спрасцілі візавы рэжым для турыстаў са 126 краін (у тым ліку і Беларусь), паведамілі мясцовыя СМІ. «Зборы за электронную візу e-Visa адменены, а працэс падачы заяў будзе значна спрошчаны. Для гэтых краін віза будзе выдавацца бясплатна як для турыстычных, так і для дзелавых мэт. Пры гэтым віза на 90 дзён будзе выдавацца на працягу 24 гадзін», — адзначылі выданні. Улады краіны таксама плануюць скараціць колькасць пунктаў у анкеце для атрымання электроннай візы — яна будзе змяшчаць 30 пытанняў замест 100. Грамадзяне краін Персідскага заліва (Саудаўская Аравія, Бахрэйн, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Кувейт, Аман і Катар) змогуць атрымаць візы па прыбыцці ў Пакістан. Як заявіў прэм'ер-міністр Пакістана Шэхбаз Шарыф, «змякчэнне візавага рэжыму дапаможа зрабіць Пакістан прывабным месцам для інвестыцый і турызму».

### Капялюш Індыяны Джонса прададзены за 630 тысяч долараў



Карычневы фетравы капялюш, спецыяльна зроблены для здымак фільма «Індыяна Джонс і храм лёсу», стаў самым дарагім лотам нядаўняга аўкцыёну ў Лос-Анджэлесе, дзе распрадаваў галівудскі рэквізіт, перадае «Бі-бі-сі». Акрамя «асабістых рэчаў доктара Джонса», на продаж былі выстаўлены і іншыя памятныя артэфакты, якія з'яўляліся на экране ў культавых фільмах пра Джэймса Бонда, Гары Потэра і герояў «Зорных войнаў». У капелюшы герой Харысана Форда, археолаг-авантурыст Індыяна Джонс, з'яўляецца ў самым пачатку фільма, калі, ратуючыся ад кітайскай мафіі, ён разам са сваімі спадарожнікамі выскоквае з самалёта, які страціў кіраванне, і апынаецца ў рацэ. Як удакладняе Hollywood Reporter, другі капялюш, які Харысан Форд насіў на здымках усё таго ж фільма «Індыяна Джонс і храм лёсу», на аўкцыёне ў 2021 годзе пайшоў з малатка за $300 тысяч.

# Пад сценамі навагрудскага замка

**На гэтым тыдні (з 23 па 25 жніўня) адзін з самых старажытных гарадоў нашай краіны Навагрудак адзначыць 980 гадоў першай летапіснай згадкі. Няшмат у нас налічваецца куткоў з такім багаццем помнікаў гісторыі і культуры.**

**Пра тое, як сёння жыве і развіваецца гэты дзіўны край, якіх поспехаў дабіваюцца яго працавітыя, добразычлівыя жыхары, напярэдадні свята карэспандэнту «Звязды» расказаў старшыня Навагрудскага райвыканкама Сяргей ЧАРКОЎСКІ.**



***— Сяргей Сяргеевіч, усё ваша жыццё непарыўна звязана з Гродзеншчынай: нарадзіліся і выраслі ў Лідскім раёне, вучыліся ў Гродне, працавалі ў Бераставіцкім і Ваўкавыскім раёнах. Якія пачуцці зведалі, калі вам прапанавалі ўзначаліць Навагрудскі раён, такі багаты гістарычнымі і культурнымі традыцыямі?***

— Як чалавек, які займаўся большую частку жыцця гаспадарчымі пытаннямі, пра гэта спачатку неяк і не задумваўся. Галоўнай сваёй задачай на той момант лічыў падтрыманне сацыяльна-эканамічнага статусу Навагрудскага раёна. Было, зразумела, пачуццё высокай адказнасці за раён з такой багатай гістарычнай і культурнай спадчынай. Але з усім багаццем Навагрудскай зямлі — прыродным і культурным — я грунтоўна азнаёміўся пазней, ужо падчас працы.

Літаральна з першых дзён знаходжання ў Навагрудку я быў зачараваны непаўторнай атмасферай, уласцівай яму. І быў узяты ў палон прыроднай прыгажосцю Навагрудчыны — яе лясамі, азёрамі, рэкамі, узвышшамі, крыніцамі. Такіх маляўнічых мясцін у Беларусі мала дзе і знойдзеш.

Асобна хачу сказаць аб жыхарах Навагрудскага раёна. Гэта людзі з унікальнымі асаблівасцямі. Іх галоўная адметная рыса — дзіўная дабрыня. Мець зносіны з імі — сапраўднае задавальненне. Кожная сустрэча з жыхарамі раёна пакідае самыя прыемныя ўражанні.

***— У якасці старшыні райвыканкама вы працуеце ўжо два гады. Што ўдалося зрабіць за гэты перыяд, як змянілася жыццё ў раёне і ў Навагрудку?***

— Хачу адразу падкрэсліць, што я прыйшоў працаваць у высокапрафесійны калектыў, які сфарміраваўся ў Навагрудскім райвыканкаме. Маю на ўвазе сваіх намеснікаў, кіраўнікоў службаў і спецыялістаў. З імі лёгка і плённа працуецца.

Як ужо было адзначана, галоўным прыярытэтам у сваёй рабоце я вызначаў сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна. Прычым асноўная ўвага — менавіта сацыяльнай сферы. Адной з галоўных задач, якая стаяла перад намі, былі мадэрнізацыя і ўдасканаленне сістэмы медыцынскага абслугоўвання. Вялікую дапамогу ў вырашэнні гэтага пытання нам аказаў кіраўнік вобласці. Ён дапамагаў і словам, і справай. Дзякуючы яго рэкамендацыям, нам удалося сур'ёзна рушыць наперад. Асабліва ў частцы медабслугоўвання сельскага насельніцтва.

Напрыклад, сёння ў Навагрудскім раёне налічваецца 19 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, што, дарэчы, складае самую высокую шчыльнасць такіх устаноў у краіне. Гэта так званыя модульныя ФАПы. Усе яны мадэрнізаваны і абсталяваны неабходнай апаратурай, уключаючы інтэрнэт-сувязь з ЦРБ і раённай паліклінікай. Усе ФАПы адпавядаюць сучасным стандартам і санітарна-эпідэміялагічным патрабаванням. У найбліжэйшых планах — рамонт і мадэрнізацыя Цэнтральнай раённай паліклінікі, аснашчэнне яе новым высокатэхналагічным абсталяваннем.

Паклапаціліся мы і пра медыцынскіх работнікаў, асабліва пра маладых спецыялістаў, якія прыязджаюць працаваць у наш раён пасля заканчэння навучальных устаноў. Ствараем камфортныя ўмовы для працы, імкнёмся забяспечыць жыллём.

Што да сістэмы адукацыі, то тут таксама не стаім на месцы. Ствараем дастойныя ўмовы для маладых настаўнікаў, здзяйсняем рамонт навучальных устаноў. У дадзены момант у працэсе абнаўлення знаходзіцца наша самая вялікая школа — № 7 у Навагрудку.

***— Навагрудскі раён славіцца сваімі сельскагаспадарчымі і прамысловымі прадпрыемствамі. Апошнія вядомы не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і за яе межамі. Які ўклад уносяць працаўнікі раёна ў папаўненне раённага і абласнога бюджэту?***

— Эканоміка раёна актыўна развіваецца, ідзе пераўзбраенне прадпрыемстваў. У прыватнасці, на базе Навагрудскага завода металавырабаў цяпер рэалізоўваецца праграма «Адзін раён — адзін праект». Мадэрнізацыя дадзенага прадпрыемства ўключае рабатызацыю працоўнага працэсу, што вострa неабходна.

Павінен прызнаць, недахоп кваліфікаваных кадраў так ці інакш адбіваецца на дзейнасці прадпрыемстваў. Рабочыя кадры вымушаны дастаўляць з-за межаў Навагрудка. Уявіце, што кожны дзень мы прывозім на работу ў райцэнтр каля 300—350 чалавек у залежнасці ад сезона, прычым 80 чалавек прыязджаюць з суседніх раёнаў. І гэта ставіць перад намі задачу максімальна аўтаматызаваць працоўныя працэсы на вытворчасці. Менавіта па такім шляху маем намер мадэрнізаваць завод металавырабаў, які ў гэтым плане павінен стаць паказальным прадпрыемствам. А што да тых работнікаў, якіх заменяць робаты, то ім знойдзецца справа на іншых участках завода. Гэтая рэканструкцыя павінна прынесці добры эканамічны эфект, плюс павышэнне заработнай платы работнікаў.

На такім вядомым прадпрыемстве, як «Навагрудскія дары», што выпускае малочную прадукцыю, праводзіцца конкурс на пастаўку абсталявання. Мадэрнізацыя завода дасць магчымасць павялічыць вытворчасць сыру, які карыстаецца нязменным попытам у пакупнікоў. Гэты праект прынясе бюджэтнае папаўненне ў больш за мільён рублёў.

З прыбыткам працуе завод газавай апаратуры, і хаця гэтае прадпрыемства знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці, мы ганарымся яго поспехамі і радуемся за нашых землякоў. Своечасова праведзеная мадэрнізацыя дазволіла навагрудскім газавікам быць паспяховымі і канкурэнтаздольнымі на рынку.

Трэба адзначыць, што ў раёне актыўна развіваецца і прыватны бізнес. Напрыклад, СП «Лепор Пластык» з сярэдзіны 1990-х гадоў выпускае розныя рыбныя кансервы і прэсервы, а таксама агародніннныя салаты, якія карыстаюцца вялікім попытам на рынку. Сёння гэта другі па аб'ёме сродкаў плацельшчык у бюджэт раёна.

Ёсць у нас і буйное гандлёвае прадпрыемства — сетка крам «Поні». Пачыналася яно з маленькай крамкі і вырасла ў сур'ёзную сетку, якая складае канкурэнцыю такім буйным сеткам, як, напрыклад, «Еўрагандаль». Навагрудскія пакупнікі аддаюць перавагу землякам і імкнуцца наведаць менавіта крамы «Поні».

Прыкметнага поспеху дасягнула прадпрыемства «ПравітБел», якое выпускае паўфабрыкаты. Іх пельмені, бульбяныя вырабы, хінкалі і манты, бліны, варэнікі, катлеты і многае іншае на прылаўках не затрымліваюцца. Па гэтую прадукцыю заказчыкі прыязджаюць нават з Расіі.

Ну, а прадукцыю ААТ «Белкрэда» — знакамітай навагрудскай швейнай фабрыкі, якая спецыялізуецца на мужчынскім адзенні, — прадстаўляць не трэба. Яна і так добра вядома ў Беларусі і за яе межамі. Галоўная заслуга фабрыкі, у тым, што тут захавалі тыя слаўныя традыцыі, якія стварыліся ў калектыве за многія гады.

***— А як складваецца гэты год для працаўнікоў сельскай гаспадаркі?***

— Сельскагаспадарчая вытворчасць — аснова эканомікі нашага раёна. У дадзенай галіне таксама ідуць працэсы мадэрнізацыі, каб выкарыстоўваць усе існуючыя рэзервы. Летась у эксплуатацыю былі ўведзены два новыя малочнатаварныя комплексы, сёлета павінен увайсці ў строй яшчэ адзін. Узяты дакладны арыенцір на павелічэнне вытворчасці малочнай прадукцыі, паколькі ў раёне ёсць свой малочны завод, якому неабходна сыравіна. Яе пастаўкі нашым перапрацоўшчыкам абавязкова павялічым.

Уборачную кампанію завяршаем з нядрэнным вынікам. Хочацца спадзявацца, што ўжо сёлета нам удасца выканаць амбіцыйную задачу — сабраць па раёне 100 тыс. тон збожжавых. Цешыць і ўраджайнасць: на 90 працэнтах убраных плошчаў маем сярэднюю ўраджайнасць 47 цэнтнераў з гектара. Ураджайнасць рапсу склала 43,6 цэнтнера з гектара. Добрыя паказчыкі маем і па нарыхтоўцы травяных кармоў. Прычым арыентуемся не на колькасць, а на якасць. А гэта, несумненна, дасць важкі прыбавак у вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі.

Адным словам, жыхары Навагрудка і раёна падышлі да юбілею горада з добрымі эканамічнымі паказчыкамі, напярэдадні свята ім ёсць чым ганарыцца.

***— Чым здзівіце і парадуеце жыхароў горада і раёна, а таксама шматлікіх гасцей у святочныя дні?***

— У першы дзень адбудуцца раённыя «Дажынкі», дзе будзем ушаноўваць найлепшых працаўнікоў сельскай гаспадаркі. Таксама ў рамках «Дажынак» пройдзе наш традыцыйны фестываль «Сыр. Хлеб. Квас». Спадзяёмся, што ён задасць добры настрой усім удзельнікам і гасцям свята. Яшчэ 23 жніўня адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя «Навагрудскія чытанні: гісторыя і сучаснасць Навагрудскага краю». Увечары таго ж дня гасцей запросіць на замкавую гару фестываль гістарычнай рэканструкцыі, сярэднявечнай музыкі і танца «Меч караля». Каля сцен касцёла Святога Міхаіла Архангела прагучыць класічная музыка ў выкананні Сімфанічнага аркестра Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, а на цэнтральнай плошчы збярэ публіку кінатэатр пад адкрытым небам.





У праграме другога дня, які стане самым насычаным, — урачыстае адкрыццё свята з удзелам папулярных беларускіх і расійскіх артыстаў, творчых калектываў з гарадоў-пабрацімаў Навагрудка, фестываль электроннай музыкі. На Замкавай гары разгорнецца «Рыцарскі стан» — інтэрактыўная лакацыя з удзелам рамеснікаў, вулічных музыкантаў, тэатра танца, у гарадскім парку — пляцоўка «Горад дзяцінства», на вуліцы Савецкай — «Горад майстроў», у скверы каля плошчы Леніна — інтэрактыўная пляцоўка «Спорт запальвае сэрцы». Аўтааматараў чакае выстава рэтрааўтамабіляў.

У завяршальны дзень святкавання на літаратурна-музычны салон з удзелам членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі і выставу-прэзентацыю «Лэдзі Дасканаласць» запросіць Дом-музей Адама Міцкевіча. На вуліцах горада адбудзецца масавы лёгкаатлетычны забег.

Сардэчна запрашаем на наша свята!

**Сяргей РУЧАНАЎ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД і з адкрытых крыніц.**

# Як здобная пляцёнка славу гораду прынесла



## РАСКРУТКА — З ПЯКАРНІ

Адпраўным пунктам свята можна лічыць наступную падзею. У чэрвені 2021 года Аляксандр Лукашэнка наведаў невялікую хлебапякарню ў Свіслачы. Прэзідэнт высока ацаніў смак свіслацкага хлеба, асабліва здобнай пляцёнкі, якая нагадала дзяцінства. Пасля таго як у тэлеэфіры прайшоў гэты сюжэт, мясцовыя жыхары сталі пытаць у крамах хлеб, які каштаваў Прэзідэнт. Гэта стала свайго роду пасылам для раскруткі пляцёнкі, якая ў хуткім часе атрымала афіцыйную назву «Бацькава булка». Яе рэалізацыя павялічылася ў разы.

Той візіт памятае жыхарка Свіслачы Галіна Сафонава. Так здарылася, што прэзідэнцкі картэж праязджаў каля яе дома. Потым яна даведалася, што кіраўнік дзяржавы наведаў мясцовую пякарню.

— Недахопу ў хлебных вырабах няма. Асартымент вялікі: што толькі душа жадае. А на фестывалі дык наогул наўкола сапраўдныя творы мастацтва. Таму прыходзім сюды паглядзець на залатыя рукі людзей, на іх вырабы — ад гэтага на душы прыемна і радасна. Гэта бясцэннае свята, як сама праца земляробаў, — кажа жанчына. Яна асабліва адзначыла той факт, што людзі могуць жыць і працаваць пад мірным небам. А свіслацкая зямля заўсёды гатова прыняць усіх гасцінна і па-сяброўску.

І калі паўстала пытанне брэндавага мерапрыемства, ідэя прыйшла сама сабой. Фестываль адразу набыў папулярнасць, а знакамітая пляцёнка знайшла ўсё больш прыхільнікаў. Свята не засталося па-за ўвагай кіраўніка дзяржавы. Аргкамітэт сёлета быў узнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта дзеячам культуры і навукі. Па словах лаўрэата прэміі і нязменнага рэжысёра свята Вольгі Багдановіч, за тры гады яно вырасла да вялікага хлебнага фэсту. Сёлета «Бацькава булка» праходзіць пад дэвізам «Мір. Дабрабыт. Гаспадар», дзе гэтай тэме прысвечана выстаўка «Бацькаўшчына».

Як адзначыў у сваім выступленні падчас адкрыцця фэсту старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК, сімвалічна, што сёлета, калі адзначаецца 30-годдзе інстытута Прэзідэнцтва, варта ўспомніць аб вытоках галоўнага хлебнага фестывалю краіны. Губернатар нагадаў тую самую гісторыю наведвання Прэзідэнтам пякарні і яго высокую ацэнку свіслацкай пляцёнкі. А неўзабаве быў дадзены старт першаму хлебнаму фестывалю пад брэндам «Бацькава булка».

— Упэўнены, што ў каравай-фэсту вялікая будучыня, — падкрэсліў кіраўнік Гродзенскай вобласці. — З году ў год ён будзе набіраць папулярнасць, пашыраць свае межы, збіраць на блаславёнай беларускай зямлі новых удзельнікаў і гасцей. А таксама працягне здзіўляць багаццем хлеба, майстэрствам прыгатавання самых розных хлебапрадуктаў і кулінарных вынаходстваў.

## ХЛЕБНЫ РАЙ

Свята і расце, і мяняецца. Сёлета яно пашырылася да вялікага хлебнага фэсту з майстар-класамі, дэманстрацыяй конкурсных караваяў, хлебных атрыбутаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны і шырокім асартыментам хлебабулачнай прадукцыі.

— У Год якасці ўпершыню прайшоў рэспубліканскі конкурс прафесійных пекараў. Яго пераможцы змогуць размяшчаць на сваёй прадукцыі наш лагатып у розных статусах: залаты, сярэбраны і бронзавы. Гэта і ёсць наш знак якасці. Нам важна падкрэсліць значнасць працы пекараў, сфарміраваць у новага пакалення паважлівыя адносіны да людзей гэтай прафесіі, наогул да хлеба, — акцэнтавала рэжысёр свята.



Начальнік упраўлення гандлю і паслуг Гродзенскага аблвыканкама Вольга Карачун удакладніла, што ў рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства ўзялі ўдзел 36 суб'ектаў гаспадарання з розных рэгіёнаў. У пяці намінацыях было прадстаўлена звыш 130 найменняў прадукцыі. Да конкурсу праявілі інтарэс не толькі вытворцы, але і суб'екты грамадскага харчавання, якія выпякаюць хлебныя вырабы ў невялікай колькасці. Прадукцыя пераможцаў якраз і была прадстаўлена на каравай-фэсце ў Свіслачы.

Вольга Перахвал з вёскі Чамяры Слонімскага раёна — адна з іх. Яна прывезла адразу некалькі сваіх караваяў, у тым ліку вясельны, які гатавала тры дні. Фантазія і натхнёнасць робяць яе вырабы адметнымі. Дарэчы, Вольга выходзіла пераможцай на многіх конкурсах, а леташні яе каравай, які заняў першае месца на абласных «Дажынках», цяпер упрыгожвае экспазіцыю ў Палацы Незалежнасці ў Мінску. Вага яго — амаль 30 кілаграмаў. Сёлета жанчына таксама ў лідарах. За паўтара года яна выпекла амаль 70 вялікіх вясельных караваяў. А яшчэ больш за 200 такіх, якімі сустракаюць маладых хлебам-соллю.

— Калі мой каравай прывезлі ў Італію, людзі не верылі, што ён сапраўдны, а калі яго разрэзалі і пакаштавалі, сказалі такую фразу: «Якія беларусы малайцы». Для мяне гэта вялікі гонар, — кажа жанчына. — Я вельмі люблю каравай-фэст, таму чакаю гэтае свята з нецярпеннем. Хлебны фестываль — працяг традыцый і абрадаў, трэба прывучаць новыя пакаленні да гэтага, напрыклад, мае дзеці цягнуцца за мной, у нас вельмі моцна пераплецены традыцыі нашых продкаў і сучаснасць. Дарэчы, у жанчыны сямейны бізнес, свая падсобная гаспадарка, іх хлебныя вырабы ёсць і на прылаўках крам пад брэндам «Смаката».

А вось Алена Сашко, загадчыца Камянецкага цэнтра рамёстваў і культуры, прыехала сюды ўпершыню. На яе караваі адно з цэнтральных месцаў займае вялікі бусел: кампазіцыя так і называецца «Пад белымі крыламі». І гэта першы ў яе жыцці каравай, які яна гатавала па бабуліным рэцэпце. А вось бусел — уласная фантазія. Напрыклад, для натуральнасці крылаў яна выкарыстала вафельную паперу двух відаў, сцяг — з рысавай паперы.

— Я вырашыла аб'яднаць традыцыі і сучаснасць. Дапамагаюць і новыя тэхналогіі. Шмат ёсць для ўпрыгожвання: напрыклад, спецыяльны формы, масціка, харчовыя фарбы, у тым ліку залатыя. Хто мог раней уявіць, што золата будзе ядомым? — жартуе Алена.



Дарэчы, наўрад хто мог уявіць, што і цеста — гэта добры матэрыял для будаўніцтва замкаў і старажытных аб'ектаў. А фармоўшчык прадпрыемства «Гроднахлебпрам» Яўген Гараўскі даказаў, што гэта магчыма. З цеста ён стварыў макет гродзенскага каралеўскага замка і Каложскай царквы, прычым у іх першапачатковым выглядзе. Праца заняла больш месяца, затое работу высока ацанілі — вырабы занялі першае месца. А яшчэ тры дні майстар спецыяльна да каравай-фэсту пёк гіганцкі каравай вагой 140 кілаграмаў. Між іншым, пяцімятровая пляцёнка, якой частавалі ўсіх наведвальнікаў, таксама была выраблена на «Гроднахлебпраме».

Экскурсавод Вераніка Бібікава расказала пра розныя віды хлеба, якія ўвайшлі ў склад асобнай экспазіцыі. Гэта і манастырскі, і блакадны, і хлеб Перамогі, і нават «зайцаў» хлеб. Асаблівую цікавасць выклікаў хлеб для касманаўтаў. Аказваецца, гэта новая распрацоўка спецыялістаў Маскоўскага інстытута хлебапячэння. Менавіта такі хлеб спажывала ў космасе і беларуска Марыя Васілеўская падчас палёту. Ён раздзелены на невялікія кавалкі, нагадвае шакаладную плітку. 4,5 грама — адзін кавалачак. Хлеб спецыяльна даставілі з Масквы на беларускі каравай-фэст.

## ХТО ЗАХОЎВАЕ РЭЦЭПТЫ ДАЎНІНЫ?

Увайсці ў стылізаваную хатку запрашае загадчыца аддзела Свіслацкага раённага цэнтра народнай творчасці Таццяна Вярбіцкая. Тут прадстаўлены хлебныя вырабы, якія адноўлены па старажытных рэцэптах і з'яўляюцца элементамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. «Гэта тое, чым мы ганарымся, — кажа суразмоўца, — мы вяртаем з небыцця старажытныя рэцэпты, якія дайшлі з далёкіх часоў, і даём ім новае жыццё». У ліку такіх вырабаў — поразаўская банкуха, ваўкавыскі і слонімскі вясельныя караваі, жытні хлеб з Жораўкі і Кузьмічоў Мінскай вобласці, грачаны хлеб з Маларыты, хатні хлеб з Адэльска Гродзенскага раёна. Яны розныя, але адпавядаюць тым рэгіёнам, дзе захаваліся традыцыі іх выпечкі.

Напрыклад, у Слоніме гэту справу працягвае народны фальклорны калектыў «Чараўніцы-каравайніцы». Яго кіраўнік Дар'я Кірыенка кажа, што гэтай традыцыі больш за сто гадоў, у раёне ёсць нават мясцовае свята «Паўлаўскі каравай». На фэст, акрамя вясельных караваяў, жанчыны прывезлі і так званы Траецкі каравай, які выпякаецца на свята Троіцу і сімвалізуе сабой урадлівае поле.

Загадчыца Поразаўскага сектара культуры Алена Андрушка частавала гасцей фэсту знакамітай банкухай. А выпякае складаны кандытарскі выраб яе маці з сяброўкай, традыцыя ідзе ад бабулі, і цяпер сама Алена таксама далучылася да справы. Каб атрымаўся паўнавартасны выраб, трэба змяшаць 60 яек і па кілаграме цукру, масла, смятаны ды мукі. У працэсе ўдзельнічае тры чалавекі, бо трэба круціць вал і ліць цеста. Робіць банкуху і на продаж, адзін выраб каштуе 250 рублёў. Затое можна быць упэўненым, што ўсе складнікі натуральныя, без стабілізатараў і парашкоў.

## СВЯТА ЯК НАБЫТАК ДЛЯ МЕСЦІЧАЎ

Марыя Аляксандраўка прыйшла на фестываль з унукамі. Кажа, што яны вельмі чакалі гэты дзень. А сын нават узяў удзел у лёгкаатлетычным забегу на 10 кіламетраў «Белавежскія зубры», які прайшоў у рамках фэсту. «Такіх свят у нас ніколі не было, ёсць што паглядзець, хоць спякота стаіць, але людзі прыехалі — з раёнаў, з абласцей. У нас чыста, прыгожа, на палях усё ўбрана — душа радуецца», — выказвае свае пачуцці жыхарка Свіслачы.

Васіль і Часлава таксама мясцовыя. Яны прыйшлі на свята з усімі чатырма дзецьмі. Сям'я атрымала кватэру як шматдзетная, карыстаецца сацыяльнымі льготамі, дапамагае і арганізацыя, дзе працуе Васіль. Маюць планы набыць дом за мацярынскі капітал. «Я родам з вёскі, але большую частку жыву ў Свіслачы, мне тут усё падабаецца: і мая праца, і горад, і ўвогуле мая краіна», — кажа ён.

Трэба сказаць, што на свяце вельмі шмат гасцей. Напрыклад, Ганна і Андрэй з дзецьмі прыехалі да бабулі з Гродна. Даведаліся пра фестываль і вырашылі пабываць. Ганна кажа, што не чакалі такога маштабу, бо звычайна ў раёнах святы не такія вялікія. Асабліва ўразілі караваі, вельмі шмат палатак са стравамі, і дзецям тут цікава. Андрэй дадаў, што да гэтага ў сям'і не каштавалі «бацькаву» пляцёнку, таму з фестывалю павязуць менавіта гэты выраб. Таксама госці адзначылі, што Свіслач прыгажэе і набывае сучасны выгляд.

— Рыхтуемся да свята, вядома, горад прыводзіцца ў парадак, усе арганізацыі і прадпрыемствы стараліся штосьці добраўпарадкаваць. Напрыклад, тая ж хлебапякарня набыла зусім новае аблічча, мадэрнізавана. Летась падчас правядзення фэсту ў нас быў адкрыты новы стадыён, у найбліжэйшых планах — будаваць арэнднае жыллё і басейн, — паведаміў старшыня Свіслацкага райвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ.

Па словах старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алены ПАСЮТЫ, такія святы — магчымасць паказаць свае набыткі, творчы патэнцыял, тым самым зацікавіць наведвальнікаў. «Любое брэндавае свята садзейнічае развіццю тэрыторый, бо рэкламуе ўсё тое, што тут ёсць, вырабляецца і прадаецца. Пры гэтым усіх аб'ядноўваюць традыцыі, магчымасць дакрануцца да народнай творчасці і адчуць сябе часткай вялікай сям'і», — лічыць кіраўнік дэпутацкага корпуса рэгіёна.

Павіншаваць усіх прысутных са святам прыехаў у Свіслач і сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Парыжы Яўген Залатой. Кажа, што гэта першая ў яго жыцці такая ганаровая місія. Але ён ведае, што беларусы сачылі за яго воднымі гонкамі, перажывалі, таму разам з сям'ёй прыехаў падзякаваць за падтрымку. Яўген таксама звярнуў увагу на гарадское асяроддзе. «Як чалавеку родам з вёскі, мне прыемна бачыць, як мяняецца беларуская глыбінка, бачу, як развіваюцца маленькія пасёлкі, многія рамантуюць дамы і будуюць новыя, людзі вяртаюцца жыць у сельскую мясцовасць, і думаю, што гэта цудоўна», — выказаўся Яўген.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению **Унитарного предприятия**
**«Торговая компания «Комплимилк Трейд»** (продавец)
проводит открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ с инв. № 500/D-798806467

*(наименование – торговое помещение)*

**общей площадью 399,3 кв. м,**
**расположенного в здании многофункциональном на 1-м и подвальном этажах, адрес: г. Минск, ул. Лидская, 10-7, и**

## оборудования

*(40 ед., перечень у организатора аукциона)*.

Начальная цена с НДС (20 %) – **1 266 304,80** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **126 630,00** бел. руб.

**Задаток перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 *(десяти)* рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты производится в течение 30 *(тридцати)* банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трёх) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **24.09.2024** в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.09.2024** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 029 854 85 66, 8 029 880 95 50.**

УНП 692061583

---

Организатор торгов –
**частное предприятие «ПАКУМ» –**
извещает о проведении вторых
повторных торгов в форме открытого аукциона
по продаже имущества
ликвидируемого юридического лица –
**ООО «Лестракинвест».**

Аукцион состоится **19.09.2024 г. в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Смолячкова, 9, каб. 426

| № лота | Наименование Лота | Начальная цена Лота с НДС 20 %, руб. | Шаг торгов 3 %, руб. | Задаток 1 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 7 | Автомобиль легковой Volkswagen Polo, 1.6Б, АКПП, 2021 г. в. | 35 520,00 | 1 065,60 | 355,20 |

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ООО «Лестракинвест», тел. +375291307853 |
| **Организатор торгов** | Частное предприятие «ПАКУМ», г. Минск, ул. Смолячкова, 9-426, +375293321936 |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | Частное предприятие «ПАКУМ», УНП 191274798, р/с BY72 ALFA 3012 2E32 2100 1027 0000 в ЗАО «АЛЬФА-БАНК», г. Минск, БИК ALFABY2X4 |

Заявки на участие в торгах принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в срок до 15.00 18.09.2024 г. Подробная информация о составе Лота на сайте pakum.by. Осмотр лота в рабочие дни по предварительной записи по тел. +375291307853. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения и определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте организатора аукциона – https://pakum.by

---

Центр Промышленной Оценки
• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | СТОАО «Світанак», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 4. УНП 500041006 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**31/50 доли в праве собственности на здание нежилое**

(назначение: здание нежилое, инв. № 450/С-2946, 6158,8 кв. м).
Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Коссовский Тракт, 100**

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 3 817 200,00 бел. руб.**

***Сведения о земельных участках, на которых расположена 31/50 доля в праве собственности на здание нежилое с инв. № 450/С-2946:*** пл. 0,8074 га предоставлен на праве постоянного пользования; три участка предоставлены на праве аренды (срок действия: по 11.05.2072) пл. 0,0001 га, 0,0001 га, 0,0016 га

**Обременения:** площади здания, принадлежащие продавцу, частично сданы в аренду. Подробная информация у организатора торгов и на сайте cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 2 % от цены продажи Лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 04.09.2024 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 03.09.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны:**
**+375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ЗА ОДНУ БАЗОВУЮ ВЕЛИЧИНУ

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»,
г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 212 24-63-12, +375 29 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.
**Продавец:** ОАО «Витебскоблавтотранс», 210601, г. Витебск, ул. С. Панковой, 1, тел.: +375 (212) 22-80-44, +375 (2132) 6-19-07.

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 236/С-14256 общей площадью 479,0 кв. м, наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное, по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Черныша, 39, на зем. участке с кадастровым № 222155200001000842 площадью 1,1032 га по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Черныша, 39 (право постоянного пользования). Целевое назначение зем. участка – для размещения объектов административного назначения.

**Нач. цена:** 1 базовая величина (40,00 рублей).

**Задаток:** 1 базовая величина (40,00 рублей).

**Лот № 2.** Кап. строение с инв. № 225/С-13397 общей площадью 676,0 кв. м, наименование – гараж на 16 мест, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Черныша, 39, на зем. участке с кадастровым № 222180290410000068 площадью 0,1182 га по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. п. Бегомль, ул. Черныша, 39 (право постоянного пользования). Целевое назначение зем. участка – для обслуживания гаража на 16 машино-мест.

**Нач. цена:** 1 базовая величина (40,00 рублей).

**Задаток:** 1 базовая величина (40,00 рублей).

**Дата, время и место проведения аукциона: 04.09.2024 в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в здании ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 21.08.2024 с 08.30 по 03.09.2024 до 17.30.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK 30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901.**

Условия аукциона: Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по нач. цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, подписать договор купли-продажи в течение 11 рабочих дней с даты утверждения протокола аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, определенные условиями договора купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета аукциона. **Аукцион проводится в порядке, установленном Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 05.05.2009 г. «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Положением «О порядке организации и проведении торгов по реализации имущества ОАО «Витебскоблавтотранс» от 23.05.2024.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявления на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ.лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, расходах на проведение независимой оценки письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. **Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (29) 7121271.**

---

**Брестский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1: Трактор «Беларус-2022.3», год выпуска 2009 г., регистрационный номер АМ-1 3487** | 11 760,00 | 1 176,00 |

**Местоположение объекта:** Брестская обл., Кобринский р-н, д. Октябрь. **Продавец:** ОАО «Городец-агро», Брестская обл., Кобринский р-н, д. Городец, тел./факс 80162 91 91 32. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Условия оплаты: в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 24 сентября 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 23 сентября 2024 г. до 17.00**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ

Организатор торгов: **ООО «ТрастАудитКонсалт»** (УНП 692017051),
222304, Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14, тел. (8029) 777-91-61.
Продавец: **ОДО «Белсепт НПК» (УНП 193638261)** в лице ликвидатора ООО «ТрастАудитКонсалт».
Публичные торги в форме аукциона в процедуре ликвидации будут проведены **05.09.2024 г. в 16.00**
по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 12.

| № Лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС, BYN |
|---|---|---|
| 1 | Смеситель промышленный РПМ-20В.Б.-11ПР в комплекте с вакуумным насосом и комплектом деталей парогенератора | 11820,00 |
| 2 | Реактор Ф1200х1500h 1,5 м³ на подставке | 1080,00 |
| 3 | Резервуар РВ-4ТИ-ЭП с лестничной площадкой оператора, шкафом управления | 6660,00 |
| 4 | Система деминерализации воды | 324,00 |
| 5 | Система очистки воды IWP-RO-04-4 (с мембранами) | 4704,00 |
| 6 | Этикеровщик полуавтоматический DWR ROUND | 1056,00 |
| 7 | Производственное оборудование (спецификация 1) | 1428,00 |
| 8 | Мебель лабораторная (спецификация 2) | 948,00 |
| 9 | Офисная мебель (спецификация 3) | 918,00 |
| 10 | Система вентиляции для производственного цеха (спецификация 4) | 1140,00 |
| 11 | Тара для антисептиков и моющих средств (спецификация 5) | 4283,47 |
| 12 | Гофроящики (спецификация 6) | 5535,15 |
| 13 | Дозаторы и распылители (спецификация 7) | 11172,41 |
| 14 | Крышки для ёмкостей (спецификация 8) | 1740,20 |
| 15 | Нетканые полотенца (спецификация 9) | 647,72 |
| 16 | Химические вещества для производства дезинфицирующих и моющих средств (спецификация 10) | 19934,24 |
| 17 | Химические вещества для производства дезинфицирующих и моющих средств (спецификация 11) | 3493,91 |
| 18 | Химические вещества для производства дезинфицирующих и моющих средств (спецификация 12) | 4234,40 |
| 19 | Химические вещества для производства дезинфицирующих и моющих средств (спецификация 13) | 5627,68 |
| 20 | Химические вещества для производства дезинфицирующих и моющих средств (спецификация 14) | 4773,38 |
| 21 | Химические вещества для производства дезинфицирующих и моющих средств (спецификация 15) | 1437,14 |
| 22 | Этикетки и вкладыши для дезинфицирующих и моющих средств (спецификация 16) | 3373,30 |
| 23 | Лабораторное оборудование (спецификация 17) | 2760,00 |
| **Имущество б/у, местонахождение имущества: г. Минск, ул. Красноармейская, 21/6** | | |

**Продавец является плательщиком НДС.**
Телефон для ознакомления и осмотра +37529 7779161.

Дополнительные сведения об имуществе, спецификациях и порядке проведения аукциона опубликованы: https://cloud.mail.ru/public/fLjG/n5jWJ2vdX

**Для участия в торгах необходимо в срок до 10.00 02.09.2024:**

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах по электронной почте info@truster.by либо по адресу г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 12;

2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY88UNBS3012 2173 7000 0000 0933 в ЗАО «БСБ Банк», BIC: UNBSBY2X, получатель – ООО «ТрастАудитКонсалт», УНП 692017051.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов.

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в размере 5 % от цены продажи в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 календарных дней со дня проведения торгов, но не ранее возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 24.05.2024, 29.06.2024, 16.07.2024, 03.08.2024

# «ЗЯЛЁНАЯ» ДЫПЛАМАТЫЯ І ЭКАТУРЫЗМ

## Гісторыя аднаго супрацоўніцтва

**Пытанні аховы навакольнага асяроддзя, якія стаяць сёння перад нашай краінай, патрабуюць кансалідацыі намаганняў па экалагічнай асвеце насельніцтва, развіцці экатурызму, падтрымцы грамадскіх экалагічных ініцыятыў. Значная роля ў гэтым належыць Рэспубліканскаму цэнтру дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Мінпрыроды, які ўжо некалькі гадоў актыўна супрацоўнічае з Расійскім экалагічным таварыствам.**



**Колькасць партнёраў Вучэбнага цэнтра паступова павялічваецца. Летась у рамках IX Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі да супрацоўніцтва далучылася Грамадская палата Разанскай вобласці, з якой быў падпісаны адпаведны дакумент. Сёлета падключыліся прадстаўнікі Нацыянальнага цэнтра кампетэнцый экалагічных рэформ Расійскай Федэрацыі, упраўлення па экалогіі, гандлі і муніцыпальным кантролі адміністрацыі горада-курорта Есентукі, ЦНДІКВВР.**

Амаль тры гады таму, улетку 2021 года, Рэспубліканскі цэнтр дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Мінпрыроды (Вучэбны цэнтр) наведала дэлегацыя агульнарасійскай грамадскай арганізацыі па ахове і абароне прыродных рэсурсаў «Расійскае экалагічнае таварыства» (РЭТ). Падчас візіту быў падпісаны Пратакол аб намерах супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў. Дакумент накіраваны на павышэнне эфектыўнасці сумеснай дзейнасці па экалагічнай асвеце насельніцтва, рэалізацыі праграм узаемадзеяння на прыгранічных асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях (ААПТ) і трансгранічных водных аб'ектах, па папулярызацыі і развіцці экалагічнага турызму, інстытута грамадскіх эколагаў.

Першы круглы стол з міжнародным удзелам адбыўся ў снежні 2021 года. Абмеркаваць тэму «Экалагічная адукацыя: вопыт краін блізкага замежжа, праблемы і перспектывы» сабраліся прадстаўнікі мінскага гарадскога і абласнога камітэтаў прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава БДУ (МДЭІ імя А. Д. Сахарава), Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і інш. З расійскага боку прысутнічала кіраўнік Разанскага рэгіянальнага аддзялення РЭТ Віялета Чорная. Суразмоўцы выказалі гатоўнасць да далейшага плённага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і экалагічнай асветы насельніцтва.

Сустрэча атрымала вялікі рэзананс, таму ў маі 2022 года адбылося яшчэ адно мерапрыемства, гэтым разам пад эгідай РЭТ. Значнае месца дыскусіі займалі пытанні ўдзелу Вучэбнага цэнтра ў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Экалагічная бяспека рэгіёнаў Расіі: эколага-прававыя і эканамічныя аспекты ва ўмовах новай рэальнасці», IX Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, III Разанскім экалагічным форуме «Здаровае навакольнае асяроддзе — бяспека рэгіёнаў».

Праз год да супрацоўніцтва Вучэбнага цэнтра і РЭТ далучыліся рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Налібоцкі» і Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік. У рамках круглага стала «Экалагічны турызм: тэорыя і практыка, навацыі і інавацыі», праведзенага ў гібрыдным фармаце, былі закрануты тэмы, звязаныя з «зялёнай» дыпламатыяй і экалагізацыяй сферы турызму, прэзентаваны новыя падыходы да арганізацыі апошняга на ААПТ. Таксама была абмеркавана рэалізацыя праекта «Развіццё экалагічнага турызму для садзейнічання «зялёнаму» пераходу да інклюзіўнага і ўстойлівага росту».



Як адзначыў дырэктар Вучэбнага цэнтра Аляксандр Булак, сёлета, 24 мая, адбылася новая сустрэча, прысвечаная тэме «Напрамкі супрацоўніцтва Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь і Расійскага экалагічнага грамадства, Грамадскай палаты Разанскай вобласці: вынікі і перспектывы». На мерапрыемстве прысутнічалі эксперт Асацыяцыі ўнутранага і ўязнога турызму і РЭТ, старшыня Камісіі па экалогіі, ахове навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанні Грамадскай палаты Разанскай вобласці Віялета Чорная, дырэктар экспертнага дэпартамента РЭТ, намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага цэнтра кампетэнцый экалагічных рэформ Таццяна Томіна, начальнік упраўлення па экалогіі, гандлі і муніцыпальным кантролі адміністрацыі горада-курорта Есентукі Іна Зякеева. З беларускага боку далучыліся прадстаўнікі Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка — дырэктар Аляксей Цішкавец і намеснік па навуцы Максім Кудзін, дырэктар Цэнтра навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў (ЦНДІКВВР) Анатоль Сільчанка.

Разглядаліся пытанні павышэння экалагічнай адукацыі насельніцтва, добраўладкавання, ачысткі вадаёмаў. Калегі коратка прадставілі дзейнасць сваіх установ, распрацоўкі і дасягненні, у тым ліку ў сферы ўзаемадзеяння з грамадскімі эколагамі. Таццяна Томіна і Іна Зякеева адзначылі пра падыходы да папулярызацыі экадружалюбнага ладу жыцця, варыянты падтрымкі прыродаахоўных грамадскіх ініцыятыў. Аляксей Цішкавец і Максім Кудзін падзяліліся вынікамі навуковых даследаванняў на базе запаведніка, спецыфікай арганізацыі экатурызму ва ўмовах павышанага радыяцыйнага фону. Вялікую цікавасць расійскага боку выклікала справаздача Анатоля Сільчанкі аб дзейнасці ЦНДІКВВР, асабліва тэхналогіі ачысткі і рэабілітацыі водных аб'ектаў, навукова-метадычныя асновы ацэнкі рэкрэацыйнага прыроднага патэнцыялу рэк і азёраў, распрацоўка схем і праектаў водаахоўных зон і прыбярэжных палос вадацёкаў і вадаёмаў.

— Нашы традыцыйныя круглыя сталы спрыяюць шырокаму абмену вопытам і падыходамі да вырашэння розных экалагічных праблем, — адзначыў Аляксандр Булак. — Калегі прэзентуюць свае праекты і распрацоўкі, накіраваныя на паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя, перадольванне спажывецкіх адносін да прыродных рэсурсаў. Знаёмяцца з дасягненнямі іншых, робяць прапановы і дамаўляюцца аб супрацоўніцтве. Напрыклад, на сустрэчы ў маі Віялета Чорная прапанавала стварыць міжнародную аўтарскую групу сумесна з беларускімі і турэцкімі навукоўцамі, а таксама падрыхтаваць рукапіс калектыўнай манаграфіі «Аднаўленне эколага-рэсурснага патэнцыялу рачных басейнаў і развіццё турызму». З боку Расійскай Федэрацыі ўжо пацвердзілі свой статус удзельнікаў навукоўцы і эксперты Інстытута геаграфіі і Інстытута водных рэсурсаў РАН, Міністэрства аховы здароўя Расіі, РЭТ. Ад нашай краіны далучаецца ЦНДІКВВР, МДЭІ імя Сахарава, ад Турцыі — універсітэт Мугла, Environmental Problems Research and Application Center.

— Дыскусійныя пляцоўкі на базе Вучэбнага цэнтра разлічаны на практычнае і навуковае замацаванне канцэпцый і рэзалюцый, якія ў далейшым накіроўваюцца ў беларускія і расійскія органы ўлады: расійскі ўрад, Міністэрства прыродных рэсурсаў і экалогіі Расійскай Федэрацыі, Мінпрыроды Беларусі, — падкрэсліла Віялета Чорная.

— Вучэбны цэнтр праводзіць палітыку адкрытага супрацоўніцтва, — дадае Аляксандр Булак. — Мы гатовы да разгляду і рэалізацыі любых ініцыятыў і сумесных праектаў, звязаных з аховай навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў як у рамках падпісаных пагадненняў, так і ў іншых фарматах.

**Аляксандрына ПАРШЫНА.**
**Фота Вучэбнага цэнтра, Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Надвор'е

# Будзе цёпла, але з навальніцамі і парывістым ветрам

**Да плюс 33 градусаў, кароткачасовыя дажджы і парывісты вецер чакаюцца ў Беларусі на тыдні. Такі прагноз далі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Як адзначылі сіноптыкі, сёлета жнівень часта мяняе надвор'е: то дажджы, то цёплыя і нават спякотныя дні. Гэты тыдзень не выключэнне, і капрызы апошняга летняга месяца не скончацца. Актыўныя атмасферныя франты раз-пораз будуць праяўляць сябе дажджамі рознай інтэнсіўнасці, месцамі яны будуць дасягаць крытэрыяў моцных, суправаджацца навальніцамі і моцным парывістым ветрам. Разам з тым, дзякуючы трапічнай паветранай масе, у першай палове тыдня ў краіне будзе цёплае, але пры гэтым кантраснае па тэмпературным рэжыме надвор'е.

У аўторак ноччу на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень пераважна па паўднёва-ўсходняй палове пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы і моцныя дажджы. У асобных раёнах — узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Уначы і раніцай — слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 14—20 градусаў, днём — 23—29, а па паўднёвым усходзе — 30—33 градусы цяпла.



У сераду, 21 жніўня, ноччу месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём месцамі па захадзе — моцныя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы, у дзённыя гадзіны пры навальніцах — узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Уначы і раніцай месцамі — слабы туман. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад плюс 14 да плюс 19 градусаў, па поўначы — ад 11-ці да 13-ці, днём — ад плюс 23 градусаў па поўначы да плюс 34 па паўднёвым усходзе.

22 жніўня ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а днём месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах навальніцы, ноччу і раніцай — моцныя дажджы і ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Начная тэмпература паветра будзе ад плюс 13 да плюс 20 градусаў, днём — ад 19 да 24, па паўднёвым усходзе — да 29 градусаў цяпла.

У пятніцу пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах — слабы туман. Тэмпература паветра ноччу дасягне плюс 7—13 градусаў, па паўднёвым усходзе — плюс 16, днём — 20—27 градусаў цяпла.

Згодна з папярэднім прагнозам сіноптыкаў, 23 жніўня франтальныя раздзелы зрушацца за межы краіны, атмасферны ціск пачне расці. Выхадныя будуць пагодлівымі і з камфортнымі тэмпературнымі значэннямі. Так, у суботу надвор'е будзе без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах — слабы туман. Уначы слупкі тэрмометраў пакажуць плюс 10—15 градусаў, месцамі — 6—9, а днём — 25—32 градусы цяпла.

У нядзелю, 25 жніўня, таксама чакаецца пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах — слабы туман. Уначы сіноптыкі прагназуюць 11—16 градусаў, днём — плюс 26—33.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

# ГРЫБНЫ СЕЗОН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Застаецца дадаць, што ў нашы дні ў грыбы жыхары вялікіх гарадоў усё ж часцей ідуць не ў лес, а на рынак.

## КАРАЛЕЎСКІ ГРЫБ

У асартыменце рынкаў сёння ў асноўным падасінавікі, баравікі і лісічкі. На Камароўцы, зразумела, дары лесу звычайна даражэйшыя. Зрэшты, сёлета «баравік залацісты» (выраслі гэтыя грыбы, як пішуць на цэнніку, непадалёк ад горада Бярозы) можна знайсці па 30 рублёў за кіло. Грыбны выдаўся год ці не, белыя грыбы заўсёды нятанныя: баравікі з асіповіцкіх лясоў на Камароўцы — 25 рублёў за маленькае вядзерца («Паўсюль такое вядзерца 35 рублёў, бярыце, танней не знойдзеце!»), кілаграм белых аддаюць аж за 60 рублёў. У мінулым, не такім і грыбным жніўні, белыя грыбы на Камароўцы прадавалі па 45-50 рублёў за той самы аб'ём. Зрэшты, на іншыя грыбы ў гэтым «грыбным» годзе камароўскія цэны больш лаяльныя да пакупніка. Лісічкі наогул прадаюць досыць танна: кілаграм невялікіх (калі буйныя лісічкі раяць папярэдне ўсё ж крыху адварыць, то такія вось маленькія можна адразу на патэльню) прапануюць усяго за дзясятку. Падасінавікі з Пухавіцкага раёна абыдуцца ў 10 рублёў за маленькае вядзерца.

Агульнавядомае правіла: сезонныя дары лесу чым далей ад Мінска, тым танней. У гэтым грыбным жніўні яно таксама працуе. Напрыклад, на выездзе з вялікай вёскі Краснае высокую горку чырвонагаловікаў (на вока — не менш за палову пяцілітровага вядзерца) аддаюць за 8 рублёў, а на прыдарожным рынку ў Радашковічах 750-грамовы слоік, шчыльна набіты маленькімі прыгожымі лісічкамі, прапануецца ўсяго за пяць рублёў. Зрэшты, гэта ў будні дзень, да выхадных цэны могуць, няхай і нязначна, але падрасці.

Баравікоў на прыдарожных рынках няшмат, і іх хутка разбіраюць пакупнікі, якія раз-пораз выныраюць з патоку машын, што праносяцца міма па трасе.

— Раніцай баравікі былі, ужо раскупілі, — з прабачлівай усмешкай разводзіць рукамі прадавец, дзядзечка ўтульнага вясковага выгляду.

Баравік па праве лічыцца каралём сярод грыбоў: вярнуцца з лесу з поўным кошыкам белых заўсёды было поспехам. Белы грыб называюць высакародным. Кухары адзначаюць, што яго водар і смак складаецца з больш чым 70 адценняў. Антычны філосаф Пліній Старэйшы ў трактаце «Натуральная гісторыя» пісаў пра баравікі: «Белы грыб — адзіная ежа, сапраўды вартая вытанчаных асоб». Хоць у Еўропе гурманы ацанілі баравікі досыць позна — толькі ў пазамінулым стагоддзі стравы з іх былі ўключаны ў меню аднаго з вядомых у вышэйшым свеце рэстаранаў Парыжа. Сёння гэты духмяны волат — самы папулярны ў свеце сярод губчатых грыбоў (хоць кухары раюць аддаваць перавагу не вялікім, а маладым, маленькім баравікам). У нашых шыротах грыбнікі шукаюць белы грыб у іглічных і змешаных лясах з ліпеня да кастрычніка. Ад астатніх грыбоў баравік адрозніваецца высокім утрыманнем пратэіну, пры гэтым ён змяшчае ўсяго 28 ккал на 100 грамаў. Дыетолагі адзначаюць і збалансаваны склад мінералаў — калію, фосфару, жалеза. Такім чынам, пры малой каларыйнасці стравы з баравікоў служаць выдатнай крыніцай энергіі. Баравікі — скарбніца вітамінаў, асабліва групы B, да таго ж аказваюць выяўленае антыаксідантнае ўздзеянне на арганізм. Белы грыб стымулюе стрававальныя працэсы і аптымізуе работу страўнікава-кішачнага тракта.

Сёлета часцей, чым у мінулыя гады, баравікі аказваюцца чарвівымі, расказалі на прыдарожным міні-рынку ў вёсцы Краснае.

— Надвор'е вельмі спякотнае, таму больш чарвівых баравікоў, чым мінулым летам, — тлумачыць жанчына за прылаўкам. — Затое з чырвонагаловікамі сапраўды «не прамахняцеся», у іх чарвячкоў звычайна не бывае.

Суразмоўніца кажа, што чарвівы грыб вызначыць візуальна, не разрэзаўшы яго, сёлета практычна нерэальна, але яна папярэджвае пакупнікоў аб такой магчымасці. Зрэшты, пазбавіцца ад чарвякоў не так складана. Можна проста выкласці грыбы на талерку і накрыць яе харчовай плёнкай. Чарвякі адчуюць недахоп паветра і выпаўзуць са сваіх хадоў самі. Цяпер можна прыступаць да гатавання страў з вычышчаных ад чарвякоў грыбоў. Хоць надзейней усё ж грыбы парэзаць і папярэдне адварыць — 15 хвілін у падсоленай вадзе.

А вызначыць свежасць баравікоў можна па наступных прыкметах: капялюшык шчыльна прылягае да ножкі, а ўвесь грыб — вельмі шчыльны навобмацак. Ну, а калі нават сама магчымасць набыць грыбы з чарвячкамі для вас непрымальная, бярыце лісічкі — яны наогул не бываюць чарвівымі. Дзякуючы поліцукрыду хіцінманозе ў складзе лісічкі руйнуюць нервовую сістэму паразітаў — адсюль і агульнавядомы антыгельмінтны эфект гэтых грыбоў.

## ПАГАВОРЫМ АБ ПАДАСІНАВІКАХ

Падасінавікі, яны ж чырвонагаловікі, напэўна, можна назваць сімвалам гэтага жніўня: яны на прылаўках сустракаюцца часцей за іншыя. Прадаюць іх на прыдарожных рынках цяпер у сярэднім па 15—20 рублёў за трохлітровае вядзерца. Гандлявацца дарэчна.

— Адрозніць чырвонагаловікі ад падбярозавікаў можна па ножцы: у чырвонагаловікаў яна больш тоўсценькая, «каранастая», — дзеліцца Таццяна. — І ў капялюшыка больш шчыльная мякаць.

Таццяна прадае падарункі лесу на прыдарожным рынку, кіламетраў за пяцьдзясят ад Мінска. Яна тлумачыць, што збірала грыбы не тут, а далей ад буйных трас:



— Рахманькі, Вішнёўка, Касынь, — пералічвае яна вёскі, у наваколлях якіх выраслі дарункі лесу, выстаўленыя ёю сёння на продаж. — Вам гэтыя назвы, напэўна, нічога не гавораць?..

Але я нешта такое прыпамінаю: праязджала дарожныя паказальнікі. Адкуль менавіта грыбочкі, дзе сабраны, пры куплі з рук — пытанне заканамернае і разумнае. Вядома, склад макра- і мікраэлементаў грыбоў напрамую звязаны са складам глебы таго месца, дзе яны раслі і былі сабраны. У прыватнасці, грыбы актыўна назапашваюць солі цяжкіх металаў і іншыя небяспечныя рэчывы, якія ўтрымліваюцца ў зямлі ўздоўж аўтатрас. І калі на стацыянарных рынках пакупніку гарантуюць кантроль бяспекі грыбоў — ёсць і лабараторныя даследаванні, і дакументы аб тым, што дары лесу іх прайшлі, — то на прыдарожных рынках мы залежым выключна ад сумленнасці і «грыбной» кампетэнтнасці прадаўца. Але прадаўцы такіх міні-рынчакаў самі, як правіла, зацікаўлены ў тым, каб пакупнікі заставаліся задаволеныя, бо людзі за прылаўкамі тут з году ў год адны і тыя ж. І калі ў пакупніка ўзнікаюць прэтэнзіі, ён заўсёды ведае, дзе шукаць прадаўца, каб заклікаць да адказу. Так што адказнасць у апошняга не меншая, а можа быць, нават большая, чым на буйным рынку.

Дарэчы, і пакупнікі на прыдарожных міні-рынках таксама пераважаюць пастаянныя: кіроўцы грузавікоў, чый маршрут некалькі разоў на тыдзень пралягае міма гэтых месцаў, людзі, што час ад часу наведваюць сваякоў у населеных пунктах уздоўж дадзенай аўтадарогі, дачнікі, якія вяртаюцца ў горад, адпачывальнікі з навакольных санаторыяў, мясцовыя жыхары. З прадаўцамі тут часта вітаюцца як са старымі знаёмымі, ды і тыя вітаюць пакупнікоў не як чужых.



Дарэчы, асабліва важнае пытанне, дзе сабраны грыбы, у выпадку з чырвонагаловікамі — іх, як мы ўжо адзначалі, цяпер у продажы больш за ўсё, і менавіта яны валодаюць больш высокай здольнасцю, чым астатнія грыбы, паглынаць цяжкія металы і радыенукліды. Але калі сабраны чырвонагаловікі ў экалагічна чыстых месцах, яны паставяць у арганізм вітаміны (у першую чаргу B1 і PP), незаменныя амінакіслоты, якія з грыбных страў засвойваюцца на 80 %, і каштоўныя тлушчы. Усіх гэтых рэчываў больш у капялюшыках, чым у ножках, а таксама больш у маладых, невялікіх па памеры грыбах, чым у старых і буйных. Падасінавікі карысныя пры малакроўі і запаленчых хваробах. Народная медыцына лічыць, што стравы з гэтых грыбоў паскараюць гаенне ран, скарачаюць перыяд аднаўлення пры пераломах і рэабілітацыю пасля інфекцыйных захворванняў.

Як гатаваць чырвонагаловікі?

— Варыць, смажыць, марынаваць, сушыць, — дзівіцца пытанню прадавец.

Можна чырвонагаловікі і засаліць, дадае яна. А каб падчас тэрмічнай апрацоўкі грыбы не цямнелі, іх перад гатаваннем вымочваюць у растворы лімоннай кіслаты (0,5 %). Ну, а самы просты рэцэпт з чырвонагаловікаў — парэзаць іх і адварыць у падсоленай вадзе, потым ваду зліць і смажыць грыбы на сметанковым масле або раслінным алеі, з цыбуляй (па жаданні — часнаком) і заправамі да гатоўнасці. Грыбочкі атрымліваюцца вельмі духмяныя і далікатныя. Падаваць іх можна са здробненай зелянінай, а можна — са смятанай.

## НАВОШТА НАМ ЦІХАЕ ПАЛЯВАННЕ?

Ні для кога не сакрэт, што «лясное мяса» (як завуць грыбы з прычыны высокага ўтрымання бялку) медыкі лічаць цяжкай ежай з-за багацця ў іх клятчаткі хіціну, што цяжка пераварваецца. Аб карысці або шкодзе спажывання ў ежу грыбоў можна спрачацца, як і аб тым, ці ўключаць грыбныя прысмакі ў дзіцячы рацыён. Але «Звязда» пісала пра гэта не раз, паўтарацца не будзем. Цікава іншае: чаму ўсе мы так любім лясныя, сезонныя грыбы? Проста смачна? Вяртае ў дзяцінства? Мімалётнасць і кароткачасовасць грыбнога сезона працуе лепш за любыя маркетынгавыя хітрыкі?

Калі верыць навукоўцам-псіхагенетыкам, якія вывучаюць, у тым ліку, генетычна абумоўленыя паводзіны чалавека, тут справа яшчэ і ў першабытным інстынкце збіральніцтва. Як вядома, пад тонкай «скарынкай» цывілізацыі, якая нарасла на нашай свядомасці за — па мерках гісторыі — смяхотна кароткі перыяд у некалькі тысяч гадоў, утойваецца магутны пласт «напрацовак», неабходных для выжывання віду homo sapiens — пласт, што збіраўся нашымі першабытнымі продкамі мільёны гадоў. У сучасным свеце менавіта інстынкт збіральніцтва прымушае людзей калекцыяніраваць што б там ні было: ад марак і паштовак да карцін і рэтраўтамабіляў. І ён жа адпраўляе аматараў ціхага палявання кожнае лета або восень у лес у грыбы. З гэтай жа серыі — страсці рыбаловаў і паляўнічых. Але стрэліць у жывёліну — пухнатую, якая дыхае і дакорліва глядзіць у вочы чалавеку са стрэльбай, — зможа далёка не кожны. Многім нашым сучаснікам (гараджанам, што трымаюць сувязь са светам прыроды ў асноўным праз цалкам цывілізаванага, амаль ужо ачалавечанага хатняга ката) шкада нават рыбу на кручку: няхай сабе жыве, плавае ў халаднаватай, непразрыстай нашай вадзе, зіхаціць на сонейку серабрыстай лускай. А вось грыбы — не шкада: чаго іх шкадаваць? Ніякіх згрызот сумлення, адна чыстая радасць заслужанага трафея. І магутны сігнал той самай першабытнай часткі нашай падсвядомасці: усё ў парадку, з голаду не памром! Таму ў ціхага палявання столькі аматараў.

— Не разумею, навошта купляць грыбы, іх цяпер у лесе столькі!.. Ад'едзь ад Мінска ў бок Іслачы — там капялюшыкі баравікоў і чырвонагаловікаў наўпрост з акна машыны відаць! — пераконвае сяброўка.

Грыбныя месцы ў наваколлях буйных гарадоў — раней традыцыйная восеньская тэма ў сацсетках — апошнім часам выходзіць у лідары ўжо ў жніўні. Відавочна, што па чыстую «радасць трафея» ісці трэба ў лес, вытрымліваючы ўсе дэталі і нюансы агульнапрынятага рытуалу: прачынацца на досвітку, збіраць заплечнік, адмяраць нагамі кіламетры... Зрэшты, хоць пры набыцці лясных грыбоў у грыбніка з рук «імпульс збіральніцтва» слабейшы, усё ж і тут працуе той самы магутны старажытны механізм. Так ці інакш, ідзём у грыбы — хто ў лес, хто на рынак. І атрымліваем асалоду ад грыбнога сезона, які сёлета цешыць багаццем.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

## Таццяна ТРУХАН:

# «Мае мары родам з дзяцінства»

**Мастацкі кіраўнік тэатра эстраднай песні «Сябрынка» Палаца культуры МАЗ Таццяна Трухан лічыць: калі робіш сваю любімую справу з поўнай самааддачай — усё можна пераадолець і скарыць любыя вышыні. Самыя смелыя мары спраўджваюцца дзякуючы таленту і працавітасці.**

«Сябрынка» існуе ўсяго 10 гадоў, а ўжо лаўрэат многіх конкурсаў, двойчы стыпендыят Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Па выніках 2023 года калектыў атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва за развіццё лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнага мастацтва, актыўны ўдзел у мерапрыемствах патрыятычнай тэматыкі. Пагаварылі з Таццянай Трухан пра тое, чаму высокая ўзнагарода — не толькі зарад матывацыі, але і вялікая адказнасць, пра складнікі поспеху «Сябрынкі», якасці, якія патрэбны добраму артысту, і пра іншае.



## АРТЫСТ І ПСІХОЛАГ

***— Таццяна Аляксандраўна, з чаго ўсё пачалося? Як і калі музыка ўвайшла ў ваша жыццё?***

— У музыку я закахалася ў раннім дзяцінстве. Магла гадзінамі сядзець ля прайгравальніка, слухаючы ўсё — ад музычных казак да эстрады. Аднойчы глядзела «Калыханку» па Беларускім тэлебачанні, а калі загучала песня, пачала ціхенька падпяваць. «Ну што, час ісці на праслухоўванне ў музычную школу», — сказала мама. Так з шасці гадоў я пачала рэгулярна займацца музыкай. Нягледзячы на тое, што вучылася ў фізіка-матэматычным класе і нагрузка была вялікая, музычная школа была мне ў радасць. А недахоп часу толькі дапамагаў правільна выбудаваць свой дзень. Тады ж пачала спяваць — у хоры, ансамблях і сольна.

***— А будучую прафесію як выбіралі?***

— Пасля 9 класа прыняла рашэнне паступаць у Мінскі педагагічны каледж. У час вучобы ўдзельнічала ў гарадскім і рэспубліканскім этапах конкурсу «Педагагічны дэбют», дзе была высока адзначана. Каледж скончыла з поспехам. У мяне дзве вышэйшыя адукацыі, адну з іх атрымала ў Інстытуце сучасных ведаў імя А.М. Шырокава. Вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці «Педагагічная псіхалогія» — у Беларускім педагагічным універсітэце імя М. Танка. На сённяшні дзень я даволі паспяхова, на мой погляд, сумяшчаю дзве сферы ведаў — музыку і псіхалогію. Кіраўнік музычнага калектыву працуе з дзецьмі і іх бацькамі, тут задзейнічаны складаныя псіхалагічныя працэсы.

## КАМАНДА МАРЫ

***— У адным інтэрв'ю вы сказалі: «Я марыла стварыць калектыў, які стаў бы знакам якасці не толькі ў нашым горадзе, але і ва ўсёй краіне».***

— Гэта так. Усе мае мары родам з дзяцінства. У той час я захаплялася дзіцячым тэатрам-студыяй «Непаседы» з Расіі пад кіраўніцтвам Алены Пінджаян. Мне хацелася быць часткай эстраднага калектыву, але не давялося. І калі дзесяць гадоў таму дырэктар Палаца культуры МАЗ Ганна Грамовіч, запрасіўшы мяне на працу, спытала: «А вы хацелі б стварыць нешта сваё?» — я ва імгненне задумалася, таму што вопыту такога ў мяне не было. Але тут жа адказала сцвярджальна, бо менавіта пра гэта я марыла! Дырэктар прывяла мяне ва ўтульны, але пусты кабінет, паказала на сцяну і сказала: «Я хачу, каб на гэтай сцяне вісела мноства дыпломаў». І я падумала: «О, гэта добрая ідэя!»

У той момант я практыкавала як педагог па вакале, таму першымі ўдзельнікамі калектыву сталі некалькі маіх вучняў. Сёння ў нас больш за 150 чалавек. Былі, вядома, складанасці, але калі робіш сваю любімую справу, іх не заўважаеш.

***— Тэатр эстраднай песні «Сябрынка» адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва. Што вы адчулі як кіраўнік калектыву, атрымаўшы высокую ацэнку на ўзроўні дзяржавы?***

— Гэтая высокая ўзнагарода, якой мы мелі гонар быць адзначанымі, для нас не толькі зарад энергіі, але і вялікая адказнасць. Бо разумееш цяпер: на твой прафесіяналізм раўняюцца. Ты не можаш зрабіць штосьці няякаснае, мусіш быць наперадзе і заўсёды развівацца, паказваць найвышэйшы вынік. Узгадваючы пажаданні, з якімі наш Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка звярнуўся ў Палацы Рэспублікі падчас цырымоніі ўручэння прэміі да ўсіх узнагароджаных, мне хочацца ісці наперад, не спыняючыся, і прымнажаць нашы дасягненні. Такія падзеі па-сапраўднаму натхняюць.

***— Што стала галоўным фактарам поспеху калектыву: працавітасць? Ці ваша ўменне адбіраць і развіваць самыя яркія таленты?***

— На мой погляд, і першае, і другое. Любы талент патрабуе працы. І часам працавіты, натхнёны марай чалавек хутчэй ідзе наперад і дасягае мэты, чым адораны, але абыякавы. Па натуры я перфекцыяніст, дамагаюся, каб усё было зроблена па максімуме. З самага пачатку мы шмат працавалі. Рэпеціравалі 3 разы на тыдзень, па 3-4 гадзіны. Вучыліся чысціні інтанацыі, разбіралі музычныя кампазіцыі. Я старалася выхаваць у дзецях пачуццё прыгажосці і любоў да музыкі, да нашай агульнай справы. У выніку імкненне да ідэалу ўвайшло ў іх у звычку. У першыя гады свайго існавання калектыў даваў канцэрты ў Палацы культуры МАЗ і не выступаў на вялікіх пляцоўках. Але які б ні быў канцэрт, рабяты прывучаны працаваць «на тысячу працэнтаў».

І, вядома, я магу лічыць сябе ўдачлівым педагогам: вакол мяне канцэнтруюцца адораныя дзяўчаткі і хлопчыкі. Развіваючыся ў калектыве, яны пасля дасягаюць яшчэ большых вышынь.

***— Цяпер «Сябрынка» выступае на вялікіх канцэртных пляцоўках.***

— Так, і гэта наш гонар, як і ўзнагароды. Мы працуем на галоўных пляцоўках Мінска, удзельнічаем у знакавых канцэртах. Дарылі сваю творчасць гледачам на Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дзень народнага адзінства, удзельнічалі ў іншых канцэртах на сцэне Палаца Рэспублікі. Нядаўна вярнуліся са «Славянскага базару ў Віцебску». Збіраемся на вялікі фестываль Саюзнай Дзяржавы «Творчасць юных», які будзе праходзіць у Маскве.

***— У калектыва прыгожая беларуская назва...***

— «Сябрынкай» на беларускай мове называецца невялікая група людзей, якія займаюцца агульнай любімай справай. Гэта якраз пра нас! Мы заўсёды разам і дапамагаем адзін аднаму, старэйшыя — малодшым, любую задачу вырашаем творча і разам.



## ПРАВІЛЬНЫЯ СЭНСЫ

***— Раскажыце пра рэпертуар. Якія кампазіцыі выбіраеце для «Сябрынкі»?***

— У гучанні мы выкарыстоўваем сучасныя тэндэнцыі, а вось тэмы, якія транслююцца праз музычны твор, лічу, павінны быць базавыя для дзяцей і выхоўваць маладое пакаленне. Адна з галоўных для нас — тэма Радзімы. Мы спяваем пра яе цудоўную прыроду, пра тое, што кожнае дзіця ў будучыні будзе рабіць нашу родную краіну прыгажэйшай. Напрыклад, у адной з песень ёсць такія словы: «За будущее мы в ответе, но мы пока всего лишь дети». Праз песню выхаванцы ўбіраюць каштоўнасці патрыятызму.

Наступная наша тэма — такія важныя для дзяцей каштоўнасці, як сяброўства, мары, дабрыня. Нядаўна ў калектыву з'явілася новая кампазіцыя — «Фонарик добра», словы якой напісала для нас Ганна Сялук, яшчэ адзін уладальнік спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва. Аўтар музыкі — спявачка Ганна Благава. У песні ёсць такія словы: «Зажигай фонарик добра! Даже если дождь, улыбайся — скоро будет солнце опять...» Гэтай кампазіцыяй, якая заклікае несці ў свет дабро і пазітыў, мы ганарымся.

Немагчыма абысціся і без сучаснай маладзёжнай тэматыкі — напрыклад, песня «Вай-фай». А яшчэ я вельмі люблю папуры, калі па-новаму гучаць рэтра-песні. Адзін з прыкладаў — даўнія кампазіцыі Алесі з ансамбля «Сябры». Дзякуючы аранжыроўцы Рамана Козырава з ансамбля «Песняры», мы далі ім новае жыццё — вядома, з дазволу народнага артыста Беларусі Анатоля Ярмоленкі. Дарэчы, Анатоль Іванавіч адным з першых павіншаваў «Сябрынку» з атрыманнем спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва. Павіншавала і Алена Пінджаян — кіраўнік вядомага тэатра-студыі «Непаседы».

Прыадкрыю таямніцу. Мы рыхтуем прэм'еру аўтарства яшчэ аднаго зорнага дуэта: для нас напісалі песню Тэа і Вольга Рыжыкава. Прэм'ера намечана на наступны год і папоўніць партфель аўтарскіх кампазіцый «Сябрынкі».

## «СПЯВАЙЦЕ СЭРЦАМ!»

***— Вы педагог з паспяховым вопытам падрыхтоўкі юных артыстаў да рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Якімі дасягненнямі сваіх вучняў ганарыцеся?***

— Мне падабаецца выходзіць на сцэну, але ўсё ж менавіта педагогіку лічу сваім прызваннем. Першая мая педагагічная перамога — гэта Аляксандр Мінёнак, які ў самым пачатку існавання «Сябрынкі» стаў у нас займацца, і мы настолькі спрацаваліся, што ў выніку Аляксандр прадстаўляў нашу краіну на «Дзіцячым Еўрабачанні» ў 2016 годзе. Елісей Касіч разам з мамай прыйшлі да мяне на праслухоўванне ў Віцебску на фестывалі «Славянскі базар», і я зразумела, што ў хлопчыка цудоўны голас. Пасля чаго нашы заняткі працягнуліся ў Мінску, вынікам стала перамога: Елісей — уладальнік Гран-пры дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск» на «Славянскім базары» ў 2022 годзе.

Ганаруся маімі выпускніцамі, якія паступаюць у БДУКіМ, у Акадэмію мастацтваў, іншыя творчыя ВНУ. Адна з іх — студэнтка БДУКіМ Аліна Бурачэўская, цяпер — мая правая рука і памочніца, а ў будучым, спадзяюся, стане выдатным педагогам у нашым калектыве. Аліна — лаўрэат рэспубліканскага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні ў Маладзечна, удзельніца папулярнага тэлепраекта «Фактар.BY». Дарэчы, у гэтым праекце я працую ўжо трэці год як педагог па вакале. Мае вучні ў «Фактар.BY» — таксама мой гонар. У прыватнасці, сёлетні пераможца Данііл Савеня, спявак з каманды Сярогі, — менавіта ў гэтай камандзе я працавала.

***— І пры гэтым вы паспяваеце выступаць як артыст...***

— На сённяшні дзень я занятая ў некалькіх праектах. З'яўляюся салісткай вакальнай акапэльнай групы «MixFive». Супрацоўнічаю з Прэзідэнцкім аркестрам Рэспублікі Беларусь, з Нацыянальным акадэмічным аркестрам імя І. І. Жыновіча, неаднаразова працавала з Нацыянальным акадэмічным аркестрам імя М. Я. Фінберга. Супрацоўнічае з вядомымі аркестрамі і «Сябрынка», у нас ужо назапасіўся вялікі рэпертуар. Адкрыю яшчэ адну таямніцу — наш дзясяты творчы сезон хачу адзначыць канцэртам. Для мяне будзе шчасцем, калі атрымаецца зрабіць яго ў суправаджэнні аркестра. Так што на наш першы вялікі юбілей у мяне вялікія планы!

***— Як удаецца захоўваць прафесійны тонус? Што вас матывуе і заражае?***

— Матывуе любоў да таго, што я раблю. Я знайшла справу сваёй мары. Вядома, я стамляюся, калі шмат праектаў, канцэртаў, але з задавальненнем іду на работу — бо мяне чакаюць вучні, чакае любімая сцэна. А перамогі і поспехі зараджаюць энергіяй і матывуюць ісці далей.

Я шчаслівая, што маю магчымасць працаваць, развівацца менавіта ў нашай краіне, у маім родным горадзе Мінску. Зараджаюць пазітывам удзячныя вучні, удзячныя бацькі і блізкія людзі. Мая мама Наталля Іванаўна заўсёды знаходзіць для мяне цёплыя словы падтрымкі.

***— Якія якасці патрэбны, каб стаць добрым артыстам?***

— На мой погляд, сапраўдны артыст павінен быць харызматычнай асобай — чалавекам, на якога хочацца глядзець і якога падабаецца слухаць. Мая задача ў кожным дзіцяці, якое марыць аб артыстычнай кар'еры, развіць гэтую якасць. Для сучаснага артыста важна ўменне спяваць на роднай мове, бо цераз песню можна данесці сваю пазіцыю. Акрамя ўмення спяваць на рускай і беларускай мовах, артысту абавязкова трэба быць на вышыні ў плане сцэнічнай і ўнутранай культуры. Не забудзем і пра вонкавы выгляд — для любога канцэрта ён павінен быць «з іголачкі». І, вядома, вакальныя дадзеныя — неабходна шукаць свой аўтэнтычны голас, які будзе не падобны на іншыя. Вялікае значэнне мае і рэпертуар, аўтарскі матэрыял — як для салістаў, так і для мастацкіх калектываў. Я заўсёды кажу дзецям: спявайце сэрцам — і вам паверыць глядач.

***— Калектыў мары вы стварылі. Пра што марыце цяпер?***

— Мару працаваць і развівацца, каб нашы творчыя поспехі і далей былі радасцю і гонарам для роднага горада і ўсёй рэспублікі. Мару, каб мае выпускнікі вярнуліся ў калектыў і працягнулі разам са мной нашу агульную справу, каб яна квітнела. І, можа быць, калі-небудзь здзейсніцца яшчэ адна мая мара — стаць «Мінчанінам года», бо я карэнная мінчанка, люблю гэты горад усёй душой і шчаслівая, што менавіта тут маю магчымасць тварыць.

**Алена БРАВА.**

**Фота Юліі РАМАНЬКОВАЙ і дадзена суразмоўніцай.**

# ПАЦАЛАВАНЫЯ НЕБАМ

## Сярод найлепшых асаў свету пачатку XX стагоддзя і Першай сусветнай вайны былі беларусы

**...13 красавіка 1916 года з ваеннага аэрадрома пад Рыгай узняўся ў паветра цяжкі рускі самалёт «Ілья Мурамец». Камандзірам экіпажа з пяці чалавек быў 27-гадовы беларус Авянір Кансценчык. Гэты самалёт быў вельмі грознай машынай і лічыўся няўразлівым для ворага, такой сапраўднай «лятальнай крэпасцю». Але нямецкім зенітчыкам удалося-такі зрабіць немагчымае — артылерыйскім агнём падбіць «мурамца», і ён, пакідаючы шлейф чорнага дыму, стаў апускацца ўніз. Немцы трыумфавалі. А далей адбылося нешта неверагоднае: на крыле самалёта з'явіўся лётчык, які, рызыкуючы ў любое імгненне сарвацца, стаў асцярожна, але ўпэўнена, маленькімі крокамі, прабірацца да аднаго з пашкоджаных рухавікоў аэраплана...**



Самалёт «Ілья Мурамец».

У канцы жніўня 1913 года ў Кіеў на ваенныя вучэнні прыбыў малады пяхотны афіцэр Ялецкага стралковага палка Авянір Кансценчык. Ён быў камандзіраваны ў 11-ы карпусны авіяцыйны атрад у якасці назіральніка. Камандаваў гэтым атрадам славуты рускі лётчык Пётр Несцераў. Афіцэр-пехацінец быў уражаны майстэрствам пілотаў, ён зачаравана глядзеў у неба на віражы, якія выпісвалі біпланы. І менавіта тады вырашыў, што абавязкова будзе таксама лятаць. І яшчэ як лятаць!



Ваенны лётчык Авянір Кансценчык.

Авянір Маркавіч Кансценчык нарадзіўся 14 жніўня 1889 года ў Гродне ў сям'і праваслаўнага свяшчэнніка. Скончыў чатыры класы Літоўскай (Віленскай) духоўнай семінарыі (бацька хацеў, каб яго сыны таксама былі свяшчэннікамі, і старэйшы брат Авяніра, Апалінарый, пайшоў па яго слядах). Сам жа Авянір уцёк з семінарыі і ў 1908 годзе паступіў на ваенную службу — быў залічаны юнкерам у Віленскае пяхотнае юнкерскае вучылішча. Пасля яго заканчэння па 1-м разрадзе (з адзнакай), у жніўні 1910-га пераведзены з партупей-юнкераў у падпаручнікі з прызначэннем на службу ў 33-і пяхотны Ялецкі полк, які дыслацыраваўся ў Палтаве. У складзе гэтага палка і лічыўся да канца 1917 года. З 20 жніўня 1910 года служыў малодшым афіцэрам у 7-й роце палка. У лістападзе 1913 года за выслугу гадоў атрымаў званне паручніка. Па аб'яўленні мабілізацыі, у ліпені 1914-га, быў прыкамандзіраваны да Брэст-Літоўскага крапаснога авіяцыйнага атрада (авіяцыйныя атрады тады размяшчаліся менавіта пры крэпасцях — у Гродне, Брэсце, Лідзе) і накіраваны на вучобу ў Ваенную авіяцыйную школу, толькі што створаную ў Гатчыне на базе авіяцыйнага аддзела Афіцэрскай паветраплавальнай школы. А пасля яе заканчэння быў удастоены звання «ваенны лётчык» і накіраваны ў Эскадру паветраных караблёў Імператарскага ваенна-паветранага флоту.

Але гэта было пасля. А тады, на пачатку XX стагоддзя, уся Еўропа была ахоплена паветраплавальнай рамантыкай. Першы палёт аэраплана лётчыкаў-піянераў Уілбура і Орвіла Райтаў адбыўся 17 снежня 1903 года, іх машына праляцела ажно 36,5 метра за 12 секунд на вышыні каля трох метраў. А ўжо праз некалькі гадоў ва ўсім свеце з захапленнем сачылі за подзвігамі ў паветры першых авіятараў француза Анры Фармана і Луі Брэліё, англічаніна Чарльза Ліндберга, бразільца Альберта Сантаса Дзюмона... Авіяцыйныя шоу збіралі натоўпы людзей па абодва бакі Атлантыкі. Праўда, расійскія аматары паветраплавання доўгі час мелі задавальненне чытаць толькі ў газетах скупыя радкі аб незвычайных дасягненнях першых авіятараў у небе. Прарыў адбыўся 25 снежня 1910 года, калі ў Францыі першы рускі лётчык Міхаіл Яфімаў (па паходжанні — смаленскі беларус) устанавіў рэкорд па працягласці палёту. Ён выканаў свой першы самастойны палёт на аэраплане, здзейсніўшы пасадку праз 45 хвілін (звычайна пачаткоўцы-пілоты знаходзіліся ў паветры ўсяго некалькі хвілін). Далей — болей. Расія, як бы прачнуўшыся, імкліва стала даганяць упушчанае.



Пётр Мікалаевіч Несцераў.

Пачатак ваеннага паветраплавання адбыўся ў тым жа 1910 годзе, калі ў Гатчыне адкрылася першая авіяцыйная школа. Сярод яе першых выпускнікоў — праслаўлены Пётр Несцераў.

*Пётр Мікалаевіч Несцераў — рускі ваенны лётчык, штабс-капітан. Заснавальнік вышэйшага пілатажу (пятля Несцерава). Загінуў у паветраным баі, упершыню ў практыцы баявой авіяцыі прымяніўшы таран 8 верасня 1914 года.*

У студзені 1914 года ў гатчынскую вышэйшую афіцэрскую школу па рэкамендацыі Несцерава быў камандзіраваны паручнік Ялецкага пяхотнага палка Авянір Кансценчык. Пётр Мікалаевіч звярнуў увагу на маладога пяхотнага афіцэра яшчэ на вучэннях у Кіеве за год да таго.

У тым жа 1914 годзе авіяцыйным аддзелам Руска-Балтыйскага вагоннага завода ў Пецярбургу пад кіраўніцтвам І. І. Сікорскага быў створаны гігант — «Ілья Мурамец», які не меў аналагаў у свеце, з чатырма рухавікамі магутнасцю па 150 конскіх сіл кожны. Ён упершыню ў гісторыі авіяцыі быў абсталяваны асобным ад кабіны камфартабельным салонам, люксавымі спальнымі каютамі і нават ванным пакоем з туалетам. На «Мурамцы» мелася ацяпленне (за кошт адводу выхлапных газаў рухавікоў) і электрычнае асвятленне. Па бартах размяшчаліся выхады на кансолі ніжняга крыла. У 1914 годзе гэты гігант перавозіў 8—10 пасажыраў з Кіева ў Пецярбург.

Больш за тое, у лютым 1914 года Сікорскі ўстанавіў яшчэ адзін сусветны рэкорд — падняў «Ілью Мурамца» ў паветра з 16 пасажырамі на борце. Вага паднятага груза склала ў той дзень ужо 1190 кг. Падчас гэтага памятнага палёту на борце знаходзіўся яшчэ адзін пасажыр, улюбёнец усяго аэрадрома, — сабака па мянушцы Шкалік. Гэты незвычайны палёт са шматлікімі пасажырамі быў небывалым дасягненнем. «Ілья Мурамец» здзейсніў шмат палётаў над імперскай сталіцай і яе прыгарадамі. Даволі часта ён пралятаў над горадам на невялікай вышыні — каля 400 метраў. Сікорскі быў настолькі ўпэўнены ў бяспецы, якую забяспечвалі некалькі рухавікоў самалёта, што не баяўся лётаць на такой нізкай вышыні. У тыя дні пілоты, якія кіравалі невялікімі аднаматорнымі самалётамі, звычайна пазбягалі палётаў над горадам, асабліва на невялікай вышыні, таму што спыненне работы рухавіка ў паветры і непазбежная вымушаная пасадка маглі стаць фатальнымі.

Падчас гэтых палётаў, здзейсненых «Ільёй Мурамцам», пасажыры маглі зручна сядзець у зачыненай кабіне і назіраць велічныя плошчы і бульвары Санкт-Пецярбурга. Кожны палёт агромністага аэраплана прыводзіў да спынення ўсяго гарадскога наземнага транспарту, паколькі збіраліся цэлыя натоўпы, каб паглядзець на гэты паветраны цуд.

Пачатак Першай сусветнай вайны прыпыніў у Расіі далейшае развіццё грамадзянскай авіяцыі, а грамадзянскія самалёты, якія існавалі на той момант, былі пераабсталяваны для выканання баявых заданняў у сувязі з прыярытэтамі ваеннага часу.

...Пасля заканчэння на пачатку лета 1914 года гатчынскай авіяцыйнай школы ваенны лётчык Авянір Кансценчык быў накіраваны на службу ў авіяцыйны полк, які размяшчаўся на тэрыторыі Брэст-Літоўскай крэпасці. Ужо ў першыя дні вайны лётчыкі прыступілі да баявых вылетаў, у асноўным выконвалі разведвальныя функцыі, вялі аэрафотаздымкі. Пры гэтым авіятары нават дзяржаў, якія варагавалі, не баяліся адзін аднаго, і, замест стральбы па паветранай машыне праціўніка, яны віталі адзін аднаго, бо лічылі сябе калегамі, якія проста рабілі адну справу. Хоць і па розныя бакі барыкад, як кажуць. Аднак неўзабаве сітуацыя рэзка змянілася. З размахам баявых дзеянняў на франтах Першай сусветнай стала хутка зразумела, што авіяцыю можна і трэба выкарыстоўваць не толькі для разведкі. Аснасціўшы самалёты кулямётным узбраеннем, а затым і бомбамі, можна было дабіцца значна большага. І цяпер у кабіны аэрапланаў лётчыкі сталі браць бомбы і, пралятаючы над тэрыторыяй праціўніка, уручную скідвалі іх на баявую тэхніку, масты і пяхоту ворага. Вядома ж, у лёгкі самалёт многа бомб не змесціш, толькі невялікія снарады, а таму эфектыўнасць ад такой бамбардзіроўкі была невысокай. Патрэбны былі іншыя тыпы самалётаў. Адзінай машынай, якая за раз магла ўзняцца ў паветра з бомбавай нагрузкай у 500 і больш кг, і быў «Ілья Мурамец» Ігара Сікорскага. Пры гэтым палёт яго мог доўжыцца да пяці гадзін.

Да жніўня на ўзбраенні рускай авіяцыі былі толькі чатыры «мурамцы» з дзесяці, што былі заказаны ваенным ведамствам. Але ўжо ў верасні 1914-га імператар Мікалай II падпісаў указ аб стварэнні ваеннай эскадры «Ілья Мурамец» — першага ў свеце падраздзялення цяжкай бамбардзіровачнай авіяцыі. Так «мурамцы» трапілі на фронт. База «лятальных крэпасцей» (так называлі ў арміі гэтую эскадру) базіравалася ў ваколіцах Пскова. Ігар Сікорскі сам адбіраў і пілотаў для экіпажаў сваіх машын, і тэхнічных работнікаў. У гэты ж час Авяніра Кансценчыка і камандзіравалі ў адзін з баявых лётных экіпажаў. Ён стаў памочнікам камандзіра самалёта, а яшчэ праз некалькі месяцаў — камандзірам «Ільі Мурамца» № 10 (гэтыя самалёты тады нумараваліся).

Летам наступнага года баявая машына пад яго камандаваннем прыбыла на Паўночна-Заходні фронт. Першы вылет паспяховы, другі, трэці... Пры гэтым кожны баявы вылет — вялікая рызыка. Палёты ў тыл праціўніка даваліся нялёгка. Як згадваў ужо значна пазней сам Авянір Маркавіч, страх перад гібеллю жыў у кожным лётчыку. «Якой бы надзейнай ні была машына і якім вопытным — лётчык, мы ўсе ўзляталі з думкай аб смерці», — пісаў ён. Гэтае адчуванне ў расійскіх авіятараў узмацнялася яшчэ і тым, што да 1918 года яны ляталі без парашутаў — дзейнічаў загад камандуючага расійскім ваенным флотам генерал-фельдмаршала Аляксандра Міхайлавіча Раманава: парашуты не выдаваць, бо, маўляў, у складанай сітуацыі лётчык з парашутам пакіне самалёт, не спрабуючы яго ратаваць да апошняй магчымасці.

Шанцаванне было на баку экіпажа Авяніра Кансценчыка: дзясяткі паспяховых вылетаў за год. За гэты час камандзір «мурамца» № 10 быў узнагароджаны пяццю рознымі ордэнамі. Але самая высокая ўзнагарода — ордэн святога Георгія Перамогаліца — была яшчэ наперадзе.



Французскі лётчык рускай эскадры Марсель Пля.

13 красавіка 1916 года. Паўночна-Заходні фронт Рускай арміі. У гэты дзень экіпаж самалёта «Ілья Мурамец» № 10 узняўся з аднаго з аэрадромаў пад Рыгай для бамбардзіроўкі чыгуначнай станцыі Даўдзевас, захопленай ворагам, якая мела выключнае стратэгічнае значэнне як пункт боезабеспячэння. На борт было прычэплена 300 кілаграмаў бомбаў, запраўлены стужкамі ўсе восем кулямётаў, і інтэрнацыянальны экіпаж узняў баявую машыну ў паветра. Такім чынам, Авянір Кансценчык, камандзір самалёта, — беларус, яго памочнік — Віктар Янковіус — латыш, кулямётчык Георгій Шнеу — немец, механік Іван Касаткін — рускі і цёмнаскуры матарыст француз Марсель Пля, добраахвотнік, Георгіеўскі кавалер.



Першы паспяховы палёт «Флаера» братоў Райтаў, снежань 1917-га.

Пад моцным артылерыйскім і кулямётным агнём праціўніка «Ілья Мурамец» зрабіў над чыгуначным вузлом адзін круг і скінуў першую партыю бомбаў. У гэты момант варожы снарад узарваўся пад фюзеляжам машыны. Камандзір, цяжка паранены, сцякаючы крывёю, пайшоў на другі круг і скінуў астатнія бомбы. І тут — новае пападанне. Кансцэнчык страціў прытомнасць, а «Мурамец» стаў імкліва губляць вышыню. Немцы з зямлі з радасцю назіралі, як падае грозная «лятальная крэпасць». Але радасць іх была заўчаснай: памочнік камандзіра рускага самалёта Віктар Фёдаравіч Янковіус паспеў выцягнуць Авяніра Маркавіча з-за штурвала машыны і сам заняць яго месца. «Ілья Мурамец» выраўняў палёт, хоць адзін за другім выйшлі са строю яшчэ два рухавікі. Самалёт працягваў ляцець на апошнім, чацвёртым. І ў гэты момант на крыле самалёта з'явіўся чалавек. Гэта быў француз Пля. Ён стаў прабірацца да аднаго з рухавікоў, каб паспрабаваць запусціць яго. Па крылах такога гіганта лётчыкі сапраўды маглі хадзіць нават у час палёту, вядома, страхуючыся пры гэтым і стараючыся не парушаць раўнавагі машыны. У час пікіравання самалёта француз ледзьве не ўпаў, але змог дабрацца да кулямётнага гнязда і замацавацца там.

Прыблізна праз гадзіну «Ілья Мурамец» вярнуўся на свой аэрадром. У час пасадкі ў яго адвалілася правае крыло. Як высветлілася, яно трымалася ў паветры толькі дзякуючы пад'ёмнай сіле. Усяго ў самалёта налічылі 70 прабоін. За гераізм і мужнасць, праяўленыя ў баі, Авянір Маркавіч Кансцэнчык быў узнагароджаны найвышэйшай ваеннай узнагародай Расійскай імперыі для обер-афіцэраў — Імператарскім Ваенным ордэнам Святога Георгія 4-й ступені, а яго памочнік, паручнік В. Ф. Янковіус, — Георгіеўскай зброяй. Марсель Пля таксама быў узнагароджаны — салдацкім Георгіеўскім крыжам — за знішчэнне сіл праціўніка кулямётам і за тое, што на працягу 20 хвілін знаходзіўся на крыле самалёта і спрабаваў адрамантаваць рухавік.

*«Я жадаю, каб мае авіятары стаялі на той жа вышыні мастацтва, як гэта робяць рускія»*, — скажа, даведаўшыся пра гэтую гісторыю, германскі імператар Вільгельм II.

Для паручніка Авяніра Кансцэнчыка гэты баявы вылет стаў апошнім. Раненага героя даставілі ў рыжскі ваенны шпіталь, доўга лячылі, але працягваць палёты ён ужо не змог. Герой застаўся ў наземнай службе эскадры паветраных караблёў «Ілья Мурамец». Атрымаў званне штабс-капітана. А неўзабаве яго чакаў новы віраж лёсу.

...Бамбардзіроўшчык «Ілья Мурамец-16» пад камандаваннем паручніка Дзмітрыя Макшэева прыбыў у распараджэнне 3-га авіяатрада ў жніўні 1916 года. Атрад базіраваўся за 45 кіламетраў на поўдзень ад Мінска, у Станькаве. Экіпаж размясціўся ў сядзібе, а самалёт — на аэрадроме побач, у полі. Тут, у замаскіраваным ангары, размяшчаліся таксама майстэрня для рамонту, метэалабараторыя і фоталабараторыя для праяўлення плёнак і друку фатаграфій з разведвылетаў у далёкія тылы праціўніка. Камандзірам 3-га баявога авіяатрада быў штабс-капітан Іосіф Башко.

*Іосіф Станіслававіч Башко нарадзіўся 27 снежня 1888 года ў сям'і беларусаў-каталікоў у Дзвінскім павеце Віцебскай губерні. Ваенны дзеяч рускай, савецкай і латвійскай армій: ваенны лётчык, палкоўнік РІА (1917), Георгіеўскі кавалер, герой Першай сусветнай вайны — камандзір цяжкага бамбардзіроўшчыка «Ілья Мурамец» расійскай імператарскай арміі, камандзір авіягрупы цяжкіх паветраных караблёў «Ілья Мурамец» Рабоча-сялянскага Чырвонага ваенна-паветранага флоту (1918—1919); камандуючы Ваеннапаветранымі сіламі Латвіі (1938), генерал латвійскай арміі. У 1943 годзе з-за шматлікіх раненняў і траўм, атрыманых у авіяцыйных аварыях, часткова страціў зрок. Напісаў мемуары пра Першую сусветную вайну, якія былі выдадзены ў Латвіі ў 1939 годзе пад назвай «Над зямлёй ворага» (латыш. Virs ienaidnieka zemes) — на рускай мове выдадзены ў 2017 годзе пад назвай «У небе над ворагам». Адзіны лётчык, які пасадзіў падбіты самалёт «Ілья Мурамец» пры адмове ўсіх чатырох яго рухавікоў. Памёр 31 мая 1946 года.*



Іосіф Башко.

Камандзір Іосіф Башко прыбыў у Станькава на самалёце «Ілья Мурамец-Кіеўскі». Камандзірскі самалёт быў адзіным, які меў уласнае імя. У верасні 1916 года Генеральны штаб Расійскай арміі планаваў шырокае асенняе наступленне. Галоўны ўдар — на Баранавічы. Адначасова быў запланаваны і дапаможны ўдар — крыху на поўнач, у раёне Смаргоні. 12 верасня ў 7 раніцы эскадрылля з трох «мурамцаў» пад камандаваннем штабс-капітана Башко стартавала на баявы вылет. Праз нейкі час машына, якой кіраваў паручнік Д. Макшэеў, павярнула назад, да свайго аэрадрома. Заклініла правы рухавік. Астатнія самалёты працягвалі палёт і, пераадолеўшы агнявое супраціўленне ворага, наблізіліся да Баруноў. Скінулі ўсе 15 бомбаў на аб'екты праціўніка. Павярнулі дамоў, на Станькава — хапіла б паліва... Праз некалькі гадзін «Кіеўскі» сеў на аэрадроме. Усе чакалі Макшэева, які даўно павінен быў вярнуцца. У гэты час «мурамец-16» змагаўся з сямю знішчальнікамі немцаў. Экіпажу Макшэева ўдалося збіць трох з іх, але нямецкі знішчальнік збіў і яго. Абломкі машыны рухнулі на зямлю. Ніхто не выжыў. Усе чатыры члены экіпажа загінулі ад куль і асколкаў снарадаў яшчэ ў паветры. Немцы з воінскімі ўшанаваннямі пахавалі рускіх лётчыкаў у Барунах. Сёння на месцы гібелі экіпажа ўстаноўлены вялікі гранітны валун з памятным надпісам і барэльефам.



Помнік экіпажу Д. Макшэева ў Барунах на Ашмяншчыне.

З 76 «мурамцаў», якія ваявалі на франтах Першай сусветнай, толькі адзін з іх, той самы «16-ы», быў збіты знішчальнікам праціўніка. Яшчэ два бамбардзіроўшчыкі пацярпелі ад агню наземных батарэй. Пасля гэтага камандаваннем было прынята рашэнне аб узмацненні баявога суправаджэння «мурамцаў» падчас вылетаў і іх бранявой абароны. У Станькава прыляцеў Сікорскі. Ён меў адну задачу — у палявых умовах мадэрнізаваць самалёты. У прыватнасці былі абсталяваны дадатковыя кулямётныя гнёзды для кругавой абароны самалёта, у тым ліку і ў хваставой частцы. А таксама ўпершыню ў расійскім флоце ўстаноўлены электрычныя бамбаскідвальнікі.

5 лістапада 1916 года Іосіф Башко вылецеў на чарговае баявое заданне ў раён Смаргоні — лётчыкам была пастаўлена задача выпрабаваць у баі мадэрнізаваны самалёт. Нечакана ў небе ён заўважыў нямецкі «Фокер», пасля — другі, трэці... Немцы кінуліся ў атаку. «Мурамец» быў цяжкай машынай, да таго ж загружаны бомбамі. Прыняць бой — сустрэць гібель. Але Іосіф Станіслававіч прыняў выклік. Хутка кулямётным залпам быў збіты першы «Фокер», затым — яшчэ два. Астатнія не рызыкнулі наблізіцца.

...Кастрычнік 1917-га, рэвалюцыя і грамадзянская вайна падзялілі лётчыкаў на два лагеры. Авянір Кансцэнчык ваяваў у радах Добраахвотніцкай арміі на поўдні Расіі, даслужыўся да звання палкоўніка. У красавіку 1920 года ён разам з 22-гадовай жонкай і трохгадовай дачкой эміграваў спачатку ў Стамбул, а ў 1921 годзе — у Югаславію, затым вярнуўся на радзіму, у Заходнюю Беларусь (у той час — тэрыторыя Польшчы). Пражываў у Маладзечне, з 1933 года — у Стоўбцах, у свайго брата-свяшчэнніка Апалінарыя. Той і ўладкаваў яго... псаломшчыкам у мясцовую царкву, адначасова выкладаў Закон Божы ў сельскіх мясцовых школах. Памёр 29 снежня 1935 года ад тыфу. Хаваць яго прыйшоў увесь горад. Людзі толькі казалі, што памёр Авянір Маркавіч Кансцэнчык не ад хваробы, а ад баявых ран. Было яму ўсяго 46 гадоў. Праз год на яго магіле ўстанавілі двухметровы помнік. На ім — некалькі радкоў з Евангелля і подпіс: Авянір Маркавіч Кансцэнчык, палкоўнік рускай арміі, кавалер ордэна Святога Георгія, капітан паветранага судна «Ілья Мурамец».

...Ваенны лётчык Іосіф Башко апынуўся ў Чырвонай Арміі. У 1918 годзе ён пераганяў два самалёты са Станькава ў Маскву. Адзін з іх даляцеў да Барысава і зрабіў вымушаную пасадку, бо закончылася паліва. Экіпаж спаліў машыну, каб яна не дасталася немцам. Другі «мурамец», якім кіраваў сам Башко, даляцеў да Бабруйска, і там, у час запраўкі, яго захапілі ўжо салдаты 1-га Польскага корпуса генерала Іосіфа Доўбар-Мусніцкага. Гэты корпус, арганізаваны ў Расійскай імперыі з палякаў для барацьбы з немцамі, пасля рэвалюцыі адмовіўся падпарадкоўвацца бальшавікам і ўступіў з імі ў бой. Іосіфа Башко палякі прынялі за свайго. Не расстралялі, трымалі пад хатнім арыштам. Яму ўдалося збегчы... на сваім жа самалёце, які чамусьці палякі на нейкі момант пакінулі без аховы. На гэты раз ён даляцеў амаль да Смаленска. Пацярпеў аварыю ў Юхнаўскім павеце Смаленскай губерні. Пры падзенні атрымаў кантузію. Быў арыштаваны «Юхнаўскім саўдэпам па падазрэнні ў шпіянажы» і пад канвоем адпраўлены ў Маскву. Вось выпіска з архіўных матэрыялаў (на мове арыгінала і з захаваннем стылістычных асаблівасцяў):

***«Российская Федеративная Советская Республика Н. К. по В. и М. Д. Главное Управление Рабоче-Крестьянского Красного Флота. Главному Начальнику Снабжения.***

*30-го (17) июня 1918 г. № 1535. Бывший начальник 3-го боевого отряда Эскадры Воздушных Кораблей военный лётчик Башко, будучи при оккупации немцами Западного края в Бобруйске и имея намерение покинуть местность, вылетел в ночь на 23 мая на захваченном Польским корпусом Воздушном корабле «Илья Муромец» из Бобруйска, направляясь в Москву.*

*Вместе с ним вылетели состоявшие на службе в Польских войсках Петр Иванович Скуратович, Евгений Викторович Тромшинский и Иван Осипович Выржиковский, которые, по словам Башко, и подготовили возможность использования аппарата для намеченного по взаимному соглашению вылета.*

*Вследствие остановки левой группы моторов Башко вместе с названными пассажирами вынужден был опуститься в Юхнуезде у д. Желанья. При посадке все опустившиеся лица были подвергнуты задержанию местными жителями, принявшими их за немцев, и отправлены в Юхновский Уездный Совдеп.*

*Последним было сделано распоряжение об оставлении Воздушного Корабля под охраной местной милиции и об отобрании всего оружия, после чего все задержанные были отправлены под конвоем в Штаб Московского Военного Округа, откуда при сношении оперативного отдела Народного Комиссариата по Военным делам сего июня за № 1641 направлены в Главное Управление Рабоче-Крестьянского Красного Военного Воздушного Флота, причем оперативный отдел этом сношении выразил благодарность указанным лицам за доставленные сведения.*

*За сим Главное Управление приняло меры к вывозу оставшегося в распоряжении Юхновского уездного Совдепа аппарата «Илья Муромец» и находившегося на нем вооружения (2-а пулемета «Льюис», 3-и револьвера «Наган», 1-н пистолет «Маузер»).* ***Начальник Главного Управления Соловов.***

Дададзім пры гэтым толькі, што пра гэтую гісторыю даведаўся наркам па ваенных і марскіх справах Леў Троцкі, які асабіста ўручыў экіпажу грашовую прэмію — за выратаванне баявой машыны з польскага палону. Іосіф Башко стаў першым у сусветнай гісторыі лётчыкам, які змог уцячы на самалёце з варожага палону. Гэты подзвіг нашы пілоты паўтораць толькі праз чвэрць стагоддзя, калі савецкія лётчыкі на чале з Міхаілам Дзевятаевым у лютым 1945 года ўцякуць з нямецкага лагера.

1 чэрвеня 1918-га камандаванне РСЧА выдала загад аб аднаўленні эскадры паветраных караблёў «Ілья Мурамец» на базе старой рускай эскадры. А ўжо праз месяц Башко быў прызначаны камандуючым Паўночнай групай Паветраных караблёў, затым (з лютага 1919 года) служыў на розных камандных пасадах у авіяцыйнай групе Паветраных караблёў Рабоча-сялянскага Чырвонага паветранага флоту. У маі 1921 года па стане здароўя звольніўся з Чырвонай Арміі і вярнуўся на радзіму. Толькі радзіма яго была ўжо ў Латвіі. Яшчэ ў 1919-м частка тэрыторыі Віцебшчыны адышла да незалежнай Латвійскай Рэспублікі. У кастрычніку 1921 года ў чыне палкоўніка быў прыняты на службу ў Латвійскую армію. Стварыў першыя дапаможнікі і навучанні для лётчыкаў латвійскай авіяцыі на латышскай мове. У 1935—1937 гадах камандаваў знішчальным палком. 18 лютага 1938-га назначаны начальнікам латвійскай авіяцыі. 10 мая 1940 года атрымаў званне генерала, але неўзабаве звольніўся са службы па хваробе і да смерці ў 1946 годзе жыў у сваім доме. У 1940-м, калі Латвія ўвайшла ў склад СССР, саветы Башко не чапалі. Не чапалі яго і немцы, якія акупавалі рэспубліку ў 1941-м. Не будзе перабольшваннем сказаць, што яго паважалі і тыя, і другія.

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**

# «У АРХЕАЛАГІ ІДУЦЬ ЛЮДЗІ АСАБЛІВЫЯ»

**Адкрыцці беларускай археалогіі апошняга часу**

**У сярэдзіне жніўня адзначаецца Дзень археолага. Прафесія, авеяная рамантыкай, і вельмі важная для гуманітарнай бяспекі дзяржавы, бо менавіта знаходкі археолагаў, якія немагчыма адмаўляць ці абвяргаць, пацвярджаюць ці адмаўляюць той ці іншы гістарычны факт, спрыяюць даследаванню гісторыі беларускай дзяржаўнасці.**

Пра развіццё сучаснай беларускай археалогіі і ўнікальныя знаходкі, здзейсненыя навукоўцамі апошнім часам, расказалі самі спецыялісты.

## Палявая праца, жыццё ў палатцы, прага адкрыццяў

**Вадзім ЛАКІЗА, дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,** запэўніў, што для беларускай археалогіі час вельмі плённы. Даследчыкі працуюць у межах дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021—2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» і рэалізоўваюць Канцэпцыю нацыянальных археалагічных праектаў.

Адзін з самых значных праектаў — археалагічныя даследаванні на рацэ Менцы каля вёскі Гарадзішча. Гэта сапраўды агульнабеларускі праект, там працуе шмат валанцёраў, студэнты розных ВНУ, у тым ліку з Ваеннай акадэміі, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, ёсць дамоўленасць з Пагранкамітэтам, Інстытутам пагранічнай службы. У раскопках удзельнічаюць прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і буйных прадпрыемстваў.









Яшчэ адзін аб'ект, які ўключаны ў Канцэпцыю нацыянальных археалагічных праектаў, — падрыхтоўка і складанне археалагічнай карты Беларусі. Гэты праект разлічаны як мінімум да 2030 года. Уключаны ў канцэпцыю і такія аб'екты, як пасяленне эпохі палеаліту каля вёскі Агова Іванаўскага раёна. Гэты аб'ект цікавы тым, што пераварочвае ўяўленні аб першапачатковым засяленні тэрыторыі Беларусі. На сённяшні момант археолагі з вялікай верагоднасцю гавораць, што гэта адбылося не менш як 400 тысяч гадоў таму.

Яшчэ адзін цікавы аб'ект — Краснасельскія крэмнездабыўныя шахты. Гэтыя старажытныя шахцёры на Беларусі з'явіліся ў канцы IX—III тысячагоддзі да нашай эры. Будавалі шахты, штрэкі, падбоі, здабывалі крэмніевую сыравіну, з якой рабілі прылады працы. Там таксама можа быць створаны музейны комплекс.

Таксама вядуцца даследаванні на месцы пераправы Напалеона праз раку Бярэзіну 26—29 лістапада 1812 года каля вёсак Студзёнка і Брылі. У чэрвені гэтага года там праводзілася падводная экспедыцыя, у якой удзельнічалі і навукоўцы, і дайверы. Аб'ект разглядаецца як міжнародны праект з улікам маштабнасці падзеі.

Уключаны ў канцэпцыю таксама Крывінскі тарфянік, курганны магільнік 2-й паловы X ст. каля вёскі Азёры Круглянскага раёна, пасяленне на тэрыторыі Крупскага раёна каля возера Сялява, дзе выяўлены адзін з найстаражытнейшых пахавальных комплексаў эпохі мезаліту. Вельмі цікавыя работы праводзіліся на тэрыторыі Рэчыцкага раёна па даследаванні кургана эпохі бронзы. А каля вёскі Какорыца Драгічынскага раёна цяпер вывучаюць унікальную тарфяную стаянку неаліту.

Вадзім Леанідавіч падкрэсліў, што работа на ўсіх такіх аб'ектах магчымая толькі сумесна, пры падтрымцы мясцовых органаў улады, з прыцягненнем валанцёраў.

Яшчэ адна важная тэма — музеефікацыя, увязденне аб'ектаў археалогіі ў сферу турызму. Цяпер адна з найважнейшых задач — музеефікацыя старажытнага горада на рацэ Менцы. У Міністэрстве культуры створана рабочая група па падрыхтоўцы канцэпцыі яго музеефікацыі. Такія аб'екты вельмі патрэбныя і папулярныя — варта згадаць комплекс у Мсціславе, які ўяўляе старажытны горад, ці археалагічны музей пад адкрытым небам у Белавежскай пушчы, дзе хутка адбудзецца археалагічны фестываль.

Акрамя асноўных праектаў, не спыняюцца выратавальныя археалагічныя даследаванні, у Інстытут гісторыі паступае мноства запытаў на правядзенне археалагічнай экспертызы, узгадненне праектнай дакументацыі — такім чынам археолагі далучаюцца да сацыяльна-эканамічнага жыцця.

Вадзім Лакіза закрануў і кадравыя пытанні. На яго думку, у археалогіі ідуць людзі асаблівыя, якія маюць смак да рамантыкі: палявая праца, жыццё ў палатцы, прага адкрыццяў, пошук чагосьці нязведанага... Вядома, неабходны прыток моладзі. У гэтым годзе ў магістратуру на спецыяльнасць «Археалогія» прынята яшчэ шэсць маладых спецыялістаў, яны трапяць на работу ў Інстытут гісторыі ў якасці лабарантаў і малодшых навуковых супрацоўнікаў. Але недахоп спецыялістаў маецца.

Непакоіць дырэктара Інстытута гісторыі і пытанне пра чорных капальнікаў, якое сёння стаіць як ніколі востра:

— Заходзіш у маленькую кавярню выпіць кубачак кавы, і ўсе сцены там завешаны артэфактамі, здабытымі чорнымі капальнікамі... Хаця па заканадаўстве ў нас усе археалагічныя прадметы — уласнасць дзяржавы. Як з гэтым змагацца — будзем думаць. Гэта праблема не толькі нашай краіны. Адкрыта існуюць сайты, дзе прадаюцца артэфакты. На палях, асабліва пасля ўзворвання, з'яўляецца ўсё больш людзей з металадэтэктарамі...

Вадзім Леанідавіч лічыць, што неабходна пераглядаць канцэпцыю ўзаемадзеяння з людзьмі, якія займаюцца пошукам археалагічных артэфактаў і чорным капальніцтвам. У планах — правесці семінар-сустрэчу, на якую запрасіць такіх людзей, бо сёння праста забаранільнымі метадамі такую праблему вырашыць немагчыма. Трэба мяняць падыходы, браць усё пад дзяржаўны кантроль.

На сёння Нацыянальная акадэмія навук Беларусі выдала каля 120 адкрытых лістоў на права правядзення археалагічных даследаванняў. Нядаўна яго атрымаў прадстаўнік Чувашскага дзяржаўнага інстытута гуманітарных ведаў — установы, з якой у Інстытута гісторыі падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве.

## Рэзідэнцыя Ізяслава і візіт ваяводы Воўчы Хвост

**Аляксей АЎЛАСОВІЧ, загадчык Цэнтра археалогіі Беларусі,** нагадаў, што археалагі ўвесь час удакладняюць гісторыю.

— Росквіт беларускай археалогіі звязаны з помнікамі Старажытнай Русі. Гэты перыяд цікавы тым, што дазваляе супастаўляць летапісныя падзеі з артэфактамі і знойдзенымі ў зямлі аб'ектамі. Напрыклад, зусім нядаўна на Менцы быў выяўлены найунікальнейшы артэфакт — сякера скандынаўскага паходжання, зафіксаваная ў слаі пажару. А першае летапісная згадка Менкі — гэта 1067 год, калі князямі Яраславічамі горад быў узяты прыступам. І, мяркуючы па ўсім, гэты артэфакт суадносіцца цалкам з летапіснымі данымі. А ў 2017 годзе, вывучаючы курганны могільнік у Слаўгарадскім раёне, я атрымаў матэрыял, які цалкам укладваецца ў летапісныя паведамленні пра бітву на рацэ Пясчанік, калі передавы атрад князя Уладзіміра пад кіраўніцтвам ваяводы Воўчы Хвост разбіў радзімічаў.

Тыя, хто прысутнічаў на прэс-канферэнцыі, маглі азнаёміцца з невялікай экспазіцыяй артэфактаў з раскопак на Менцы, прычым некаторыя з экспанатаў яшчэ дзень-два таму знаходзіліся ў зямлі. Гэта дапамагло ўявіць, наколькі багаты археалагічны комплекс «Менка». Праца археолагаў там адказвае на пытанне пра паходжанне Менска. Ці ён узнік на Нямізе, ці на Менцы? А калі ёсць два пасяленні, як яны між сабой супастаўляюцца?

— Цяпер у нас ёсць адказ на гэтае пытанне, — пацвердзіў Аляксей Аўласовіч. — На Менцы сапраўды быў буйны летапісны горад. Там зафіксаваны ўнікальныя драўляныя ўнутрывальныя збудаванні, якіх ва Усходняй Еўропе літаральна на пальцах адной рукі можна пералічыць. Выдатная іх захаванасць, выдатная якасць стварэння. Аналіз паказвае, што яны ўзніклі дзесьці ў 990-х гадах. Плюс фіксуем там высакаставусныя рэчы — паясныя наборы прадстаўнікоў дружыннага саслоўя, княжацкія клеймы-трызубцы князя Ізяслава, сына Рагнеды і Уладзіміра. Мяркуючы па ўсім, Менка была адной з яго рэзідэнцый. Гэта вельмі важныя факты для вывучэнння дзяржаваўтваральных працэсаў. Мы бачым прасоўванне Полацкага княства на поўдзень, і Менск на Менцы быў адным з фарпостаў, падпарадкаваных Полацкаму княству.

У раскопе даследчыкі знайшлі пісала, зашчапкі ад кніг, што сведчыць, што ў першай палове XI стагоддзя на Менцы жылі людзі, якія ўмелі чытаць і пісаць. Знойдзены цікавыя фрагменты раменнай гарнітуры — бронзавыя спражкі і накладкі. Сустракаюцца і скандынаўскія элементы, прыкладам, фібула, сірыйскае шкло, візантыйскія амфары...

Аляксей Аўласовіч распавёў і пра іншыя аб'екты, напрыклад, курганы насып у Магілёўскай вобласці ў Круглянскім раёне вышынёй 6 м у дыяметры 30 м. Гэта самы высокі насып у Магілёўскай вобласці і адзін з найбуйнейшых у Беларусі. Там былі выяўлены ўнікальныя рэчы X ст. Аляксей Міхайлавіч прадэманстраваў прысутным пахавальную урну, якая сведчыць пра прысутнасць культуры так званых данскіх славянаў, якія жылі паўднёвей і, ратуючыся ад печанегаў, перасяляліся да нас. Цікава, што ў кургане было некалькі пахаванняў. У адным з іх чатыры гаршкі знаходзіліся ў звычайным становішчы, а вось гэты адзін чамусьці быў перакулены дагары. Пакуль навукоўцы толькі разгадваюць, чаму.

## Падводныя паселішчы

**Сяргей ЛІНЕВІЧ, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі,** таксама лічыць, што 2024 год для беларускай археалогіі быў плённы — і для падводных даследаванняў, і для сухапутных.

— Ёсць, няхай невялікія, але сенсацыі: можна павіншаваць горад Валожын з тым, што ён набыў яшчэ адзін археалагічны помнік, які можа пасля стаць архітэктурным. Ускрыты падмурак касцёла меркавана 1680 года, а побач — падмурак жылой забудовы незразумелага прызначэння. Мы напачатку вызначылі яе як плябань, але там знойдзена кафля з ініцыяламі ўладальніка. А гэта Уладзіслаў Дэнхаф, адзін з вядомых персанажаў гісторыі, герой бітвы пры Вене, якая не дапусціла турэцкую экспансію ў Еўропу. Можам казаць, што гэта пабудова была не проста плябань, дзе жыў ксёндз і прыслуга, а гэта могуць быць парэшткі палаца Слушак, папярэдніх уладальнікаў Валожына. Калі гэта пацвердзіцца, будзе яшчэ большая сенсацыя, трэба пачакаць далейшых даследаванняў.

Што да падводных даследаванняў, у гэтым годзе яны актыўныя, як ніколі. Асабліва што датычыцца Крывінскага тарфяніку ў Бешанковіцкім раёне Віцебскай вобласці. Пад слоем торфу і вады там цэлае паселішча. Слой вады не дае доступу кіслароду, няма гніення. Таму артэфакты з дрэва там захоўваюцца ідэальна. У перспектыве можна агаліць цэлую неалітычную вёску. Але гэта не так проста і патрабуе велізарных затрат, да таго ж калі такі драўляны прадмет дастаеш на паверхню, ён вельмі хутка акісляецца. У гэтым годзе з паселішча на дне тарфяніку дасталі першую ў Беларусі драўляную лыжку перыяду каменнага веку, драўляны наканечнік стралы і першы ў Беларусі грыб узростам чатыры з паловай тысячы гадоў. Міколагі павінны вызначыць, што гэта за грыб.

Сяргей Барысавіч распавёў, што, калі дасталі тую лыжку, яна была беленькая. Секунда на паветры — і яна пачынае чарнець і разбурацца. Кансервацыя такіх драўляных прадметаў вельмі складаная, дзеля чаго Інстытут заключыў дагавор з калегамі з Санкт-Пецярбурга.

Сяргей Лінёвіч лічыць, што ў перспектыве на Крывінскім тарфяніку мог бы ўзнікнуць музей падводных даследаванняў, каб наведнік мог праплысць з аквалангам і паглядзець на раскрытыя руіны. Гэта сапраўды ўражліва, бо археолагі знайшлі нават цыноўкі эпохі неаліту, зробленыя з сасновых лучын. Відэа з падводных даследаванняў Крывінскага тарфяніку можна, дарэчы, пабачыць на сайце Інстытута гісторыі.

**Людміла ІВАНОВА.**

# ТРАДЫЦЫЙ КАРАГОД

## Як стаць часткай дружнай паляшуцкай сям'і

**VIII Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся» адгрымеў 17 жніўня ў маляўнічым аграгарадку Ляскавічы. Выступленні аўтэнтычных калектываў, конкурсы, майстар-класы, работа падворкаў палескіх раёнаў «Беларускі год — святаў карагод» і шмат чаго іншага чакала гасцей фестывалю сёлета. Але пра ўсё па парадку.**

### ЯРКІ ПАЧАТАК

На адкрыцці фестывалю прысутнічала шмат ганаровых гасцей. Сярод іх — **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** Падчас размовы з журналістамі ён адзначыў, што дзякуючы такому фестывалю, як «Кліч Палесся», у кожнага ёсць магчымасць адчуць непаўторны каларыт знакамітай, аб'яднанай, дружнай паляшуцкай сям'і.

— Мы бачым, як захоўваюцца нашы знакамітыя рамёствы: кавальская справа, ткацтва, саломапляценне, бондарства і іншыя, — заўважыў ён і дадаў, што кожны раз усё больш і больш моладзі прыязджае на фестываль «Кліч Палесся»:

— Цікавасць маладых пакаленняў да традыцый, звычаяў пацвярджаюць і знакамітыя майстры, якія сёння больш актыўна пачалі працаваць. У іх па 20, па 40 вучняў з'яўляецца. Гэта значыць, яны свой талент майстра перадаюць маладому пакаленню, прывіваюць любоў менавіта да нашага, нацыянальнага.

Таксама Ігар Петрышэнка адзначыў, што турыстычны паток у Беларусі ўзрастае дзякуючы нашай адкрытасці, шчырасці. Людзі пачалі ездзіць унутры краіны, але пры гэтым развіваецца і знешні турызм. Так, за паўтара года больш чым 2 млн 260 тысяч турыстаў прыехалі да нас звонку.

— Тут, у Ляскавічах, асаблівы дух беларускага Палесся. Ён напаўняе, насычае, людзям хочацца сюды вярнуцца, — заключыў намеснік прэм'ер-міністра.

Перад пачаткам урачыстай цырымоніі адкрыцця Ігар Петрышэнка зачытаў пасланне ад кіраўніка дзяржавы. У ім адзначаецца, што самабытны фальклорны форум стаў значнай падзеяй у культурным жыцці краіны, якая беражліва захоўвае спадчыну продкаў, далучае да каштоўнага нацыянальнага багацця і садзейнічае ўмацаванню добрасуседскіх сувязяў і дружбы.

Сама канцэртная праграма ўражвала яркасцю і самабытнасцю. Немагчыма было адарваць вока ад традыцыйных танцаў і абрадаў, якія дэманстравалі са сцэны. А яшчэ падчас адкрыцця фестывалю тры ўраджэнцы беларускага Палесся атрымалі званне «Ганаровых палешукоў» за вялікі ўклад у сацыяльна-эканамічнае і грамадска-культурнае развіццё Прыпяцкага Палесся. Узнагарод удастоіліся намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Сівак, начальнік аддзела культуры Іванаўскага райвыканкама Валянціна Барадзінчык і генеральны дырэктар РУВП «Граніт» Эдуард Гаўрылковіч.

### СЯРОД МАЙСТРОЎ І РАМЕСНІКАЎ

Шырока разгарнуўся ў фестывальных Ляскавічах і Горад майстроў. Хочаш набыць шыкоўны падсвечнік ад беларускіх кавалёў — прайдзі крыху ўлева. Жадаеш плецены кошык — метраў дзесяць у бок сцэны.



Намінацыя «Ганаровы паляшук» зарадзілася разам з фестывалем «Кліч Палесся».



Палеская рыбалка — справа цікавая, асабліва калі ёсць добрыя прылады.

Нас зацікавіла кераміка з шырока вядомага на Беларусі і за яе межамі Цэнтра ганчарства вёскі Гарадная Столінскага раёна. Па словах **кіраўніка цэнтра Васіля КАЗАЧКА,** толькі яны з усёй краіны захавалі старажытную традыцыю ганчарства ва ўсіх дэталях, бо вёска Гарадная здаўна лічылася паселішчам ганчароў.

— Мы выкарыстоўваем гліну вельмі высокай якасці, якая вытрымлівае тэмпературы да 1200 градусаў. Яна добра трымае форму. Вырабы з нашай гліны трывалыя і вельмі лёгенькія. З іншай такога не зробіш. І мы яе дагэтуль капаем уручную і самі рыхтуем для працы, — падзяліўся ён. — Нашы продкі выпальвалі і наносілі ангоп. Гэта такія ўзоры, якія атрымліваюцца, калі малюеш чырвонай глінай па белай. А потым яшчэ даведаліся рэцэпт «палівы», і да гэтага часу мы робім па тэхналогіі. Яна сакрэтная, і мне яе перадаў бацька.

Майстар з часу стварэння «Кліча Палесся» не прапусціў ніводнага фестывалю. На свае вочы бачыў, як развівалася і расло гэтае мерапрыемства.

Зусім побач на беразе Прыпяці разгарнуўся самы сапраўдны пленэр. У ім удзельнічалі студэнты і выкладчыкі Гомельскага дзяржаўнага мастацкага каледжа. Незвычайна было бачыць адначасова эскізы жывапісцаў і краявід, які паслужыў ім натхненнем. Кожны мастак уносіў часцінку свайго бачання і ўспрымання гэтага асаблівага палескага аграгарадка. Па словах дырэктара навучальнай установы Алены Зейбек, яны плануюць дапрацаваць гэтыя карціны і ўжо ў верасні прэзентаваць на выставе ў гомельскім кінатэатры імя М. І. Калініна.

### ВАНДРОЎКА Ў БЕЛАРУСКІЯ ТРАДЫЦЫІ

Шмат разнастайных пляцовак разгарнулася падчас фестывалю. Мужчыны змагаліся за званне «Самага моцнага палешука», дзеці забаўляліся на тэматычнай пляцоўцы з атракцыёнамі, а жанчыны захоплена назіралі за конкурсам прыгажосці і грацыі «Палеская прыгажуня». Дарэчы, сёлета за перамогу змагаліся 13 прэтэндэнтак з Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Яны расказвалі пра свае родныя куткі, дэманстравалі яркія аўтэнтычныя вобразы і здзіўлялі талентамі. У выніку ў конкурсе перамагла 20-гадовая Аляксандра Марошкіна з Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Але рухаемся далей. У самым цэнтры фестывальнай пляцоўкі размясціліся самабытныя падворкі ад розных раёнаў Прыпяцкага Палесся. Менавіта тут можна было бліжэй пазнаёміцца з дзіўнымі традыцыямі кожнага з рэгіёнаў.

Так, Петрыкаўскі раён дэманстраваў святкаванне хрэсьбін дзіцяці і народныя абрады, якія спадарожнічалі гэтай падзеі. Традыцыйна на хрэсьбіны рыхтуецца збанок з кашай. І калі ў дом прыходзяць госці, той, хто больш заплаціць, выкупляе яго. Потым збанок разбіваецца аб кут стала, а чарапкі кладуць на галаву кожнай незамужняй дзяўчыны.

— Дзяўчына беражліва захоўвае чарапок, каб потым у яе таксама абавязкова нарадзіліся дзеці, бо чарапок у гэтай традыцыі сімвалізаваў урадлівасць, — расказвае **кіраўнік народнага калектыву аматарскай творчасці «Крэатыў» Петрыкаўскага РДК Алена ТУРАВЕЦ.**



Святкаванне хрэсьбін у Петрыкаўскім раёне напоўнена самабытнымі абрадамі.



Васіль КАЗАЧОК з вёскі Гарадной стварае посуд па традыцыйнай сакрэтнай тэхналогіі.



Мастацкі пленэр на беразе Прыпяці.

На гэтым абрады не заканчваюцца. Сярод застолля ў нейкі момант трэба абавязкова везці бабу на рэчку. Пазбегнуць купання можна толькі за выкуп.

— На ролю бабы брали замужнюю жанчыну з дзецьмі і ўнукамі. Калі дзіця нараджалася, першы раз яго купала менавіта гэтая названая баба. І па жыцці яна была з дзіцём побач, як і кумы, — тлумачыць Алена Туравец.

Паводле яе слоў, у некаторых вёсках Петрыкаўскага раёна гэты абрад жыве да гэтага часу.

— На фестывалі ў мяне была рэпетыцыя. А вось у верасні чакаюць сапраўдныя хрэсьбіны, дзе буду выконваць ролю той самай бабы, — дзеліцца жанчына.

Рухаемся да падворкаў Брэсцкай вобласці. Нашу ўвагу прыцягнула палеская рыбалка.

— Гэта вельмі займальны працэс. Справа ў тым, што палешукі не толькі любілі рыбу, але і ўмелі яе лавілі. У іх была вялікая колькасць розных прыстасаванняў, якія вельмі моцна аблягчалі працэс, — расказвае акцёр тэатра і кіно Андрэй Дзмітрычэнка, які выконваў ролю аўтэнтычнага рыбака. — Сем'і вялікія, рыбы трэба шмат. Адной вудай столькі не наловіш, таму ў іх было шмат усялякіх прыстасаванняў. Вось сёння мы паказалі, як палешукі лавілі рыбу пры дапамозе «павука». Гэта такая сетка, нацягнутая на раму, якая апускалася ў ваду. Калі рыбалка на невялікую глыбіню, то можна было чакаць, пакуль рыба сама заплыве, а можна было проста вадзіць гэтай сеткай, і калі адчуеш цяжар, рэзка падсякаць.

Паводле яго слоў, даставалі адразу вялікую колькасць рыбы, а потым традыцыйна ўся сям'я збіралася на смачную юшку.

